PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 44 (2477) Год XLVIII | Беласток, 2 лістапада 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Два мільёны палякаў у Беларусі

Яўген Мірановіч

16 і 17 кастрычніка ў Любліне адбылася вельмі цікавая канферэнцыя, прысвечаная стану адносін паміж Польшчай і Беларуссю, паміж палякамі і беларусамі. Удзельнічалі ў ёй, апрача даследчыкаў з Польшчы, польскія дзеячы з Беларусі са старшынёй Саюза палякаў Беларусі Тадэвушам Кручкоўскім.

З палякамі пра нацыянальныя справы даволі цяжка размаўляць абапіраючыся на аргументы, таму што для іх яны зусім малаважныя. Калі трэба, найвышэйшай крыніцай праўды, напрыклад, для ксяндза, можа быць нават Аляксандр Лукашэнка, хаця рэлігія падказвае яму, што ёсць яшчэ Бог. Дарэчы, праўда ў нацыянальных справах не мае ніякага значэння. Калі расказваеш ім пра вынікі шматмесячных архіўных даследаванняў, прадстаўляеш лічбы, якія разбураюць існуючую міфалогію, у адказ можна ад прафесара пачуць, што ён у гэтай справе распараджаецца іншымі інфармацыямі і называе лічбы, якія яму ў даны момант выгадныя. Калі пытаешся пасля: „Адкуль ты іх ўзяў", вучоны бессаромна адказвае: „А мне так здавалася".

Ксёндз прафесар Раман Дзванкоўскі з Каталіцкага Люблінскага універсітэта (КУЛ) даказваў, што ў Беларусі пражывае 2 мільёны католікаў. Звыш 90 працэнтаў з іх гэта палякі. Ксёндз спаслаўся на Аляксандра Лукашэнку, які публічна сказаў, што ў Беларусі каля 14 працэнтаў насельніцтва складаюць вернікі Каталіцкага касцёла. Раней прэм'ер-міністр Вячаслаў Кебіч сказаў у Ватыкане рымскаму папу, што выступае ад імя 2 мільёнаў беларускіх католікаў. „Хто ведае лепей чым улады Беларусі", — рытарычна спытаў ксёндз-прафесар. Аднак польскасць на Беларусі апынулася пад вялікай пагрозай, гаварыў вучоны з КУЛ. Ідзе вялікі ціск на беларусізацыю багаслужбы. Ксёндз даваў зразумець, што гэта вынік палітыкі ўлад. Без падтрымкі з боку Польшчы цяжка будзе затрымаць гэтую хвалю, якая вядзе да абмежавання польскасці.

Выступленне старшыні Саюза палякаў Беларусі, доктара Гродзенскага універсітэта магло сярод удзельнікаў канферэнцыі выклікаць спачуванне для беларускіх палякаў і злосць на польскіх беларусаў, якія раскідаюцца грашыма польскіх падаткаплацельшчыкаў. Можна было пачуць, што беларуская дзяржава не дае ні граша на польскую культуру, не хоча адкрыць польскага універсітэта, імкнецца да беларусізацыі Каталіцкага касцёла. Тым часам жменька беларусаў у Польшчы забірае з бюджэту кожны год звыш 5 мільёнаў злотых. На падтрымку беларускай

[працяг ☞ 2]

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Ацэнка — вельмі высокая!

З Зофіяй ТРАНЦЫГЕР-КОЧУК — падляшскім куратарам асветы, размаўляе Ганна Кандрацюк.

— Ці дырэктары або настаўнікі звяртаюцца да вас з праблемамі, якія датычаць навучання беларускай мовы?

— Калі з'яўлюцца праблемы, дырэктары і настаўнікі ведаюць, што ў нас могуць шукаць дапамогі. Апошнім часам праблем не было.

— Ці гэта значыць, што ўсё ідзе добра і паспяхова? Якая ў вас мерытарычная ацэнка навучання беларускай мовы?

— Вельмі высокая. За дзевяноста працэнтаў настаўнікаў маюць вышэйшую адукацыю і гэта выпускнікі беларускай філалогіі. Настаўнікі ў сваю чаргу могуць карыстацца спецыялістычнай дапамогай з боку метадычнага дарадчыка. Дзякуючы ангажаванасці настаўнікаў, моладзь вельмі актыўная. Прымае ўдзел у многіх конкурсах — пачынаючы ад алімпіяды і прадметнага конкурсу беларускай мовы і літаратуры, па ўсякага роду мастацкія: дэкламатарскі, тэатральны. Тут трэба адзначыць дзеянні БГКТ, якое арганізуе гэтыя конкурсы.

Пад кірункам і апекай настаўнікаў беларускай мовы працуюць таксама рэгіянальныя залы, якія нярэдка з'яўляюцца гонарам школы і крыніцай рэгіянальнай адукацыі. У Беластоцкай кураторыі аднаму візітатару даручана каардынацыя спраў звязаных з навучаннем моў нацыянальных меншасцей.

— Аднак да гэтай пары Міністэрства адукацыі не зацвердзіла яшчэ праграм па навучанні беларускай мовы.

— Мы, як кураторыя, выходзім насустрач настаўнікам, разам з беларускім бокам, аблана ў Гродне, арганізуем конкурс „Настаўнік года". Конкурс накіраваны да настаўнікаў беларускай мовы з Беласточчыны і настаўнікаў польскай мовы з Гродзеншчыны. Адна з задач конкурсу — прэзентацыя аўтарскіх праграм і пасля найлепшыя прадставім Міністэрству дзеля зацвярджэння.

— Скажыце больш пра сам конкурс.

— Конкурс — адзін з пунктаў Дамовы паміж Падляшскім куратарам асветы і Гродзенскім абласным аддзелам народнай асветы ад 25 чэрвеня 2003 года. Конкурс ставіць сабе такія мэты як: пашырэнне і дасканаленне супрацоўніцтва паміж настаўнікамі беларускай мовы ў Польшчы і настаўнікамі польскай мовы ў Беларусі, абмен творчымі досведамі ў дыдактычна-выхаваўчым працэсе і дасканаленне варштату працы настаўніка-філолага. Удзельнікамі могуць быць настаўнікі ўсіх этапаў адукацыі, калі ў іх прафесійная падрыхтоўка, калі ў іх кабінет або рэгіянальныя залы, у якіх праводзяцца ўрокі беларускай мовы, калі рыхтуюць вучняў да конкурсаў (алімпіяда, прадметны, дэкламатарскі, тэатральны).

Конкурс будзе праводзіцца ў двух этапах. У першым трэба даслаць свой адукацыйны праект або аўтарскую праграму навучання на любы этап навучання, сцэнарый урокаў або пазаўрочных заняткаў.

На другім этапе створаная куратарам камісія, якая раней выбірае дзесяць найлепшых прапаноў, пабачыць і ацэніць адкрытыя ўрокі, якія правядуць удзельнікі.

Конкурс пачынаецца 15 кастрычніка 2003 года і будзе праходзіць да 15 мая 2004 года. Падвядзенне вынікаў адбудзецца ў Гродне пры канцы мая будучага года.

— Раней настаўнікі атрымоўвалі з Беларусі дапаможнікі і літаратуру. Ці зараз ёсць такія сувязі і абмен літаратурай на афіцыйным узроўні?

[працяг ☞ 3]

Добры клімат для супрацоўніцтва ☞ 3

Сродкаў на беларускія мерапрыемствы крыху больш чым было. Ёсць добры клімат у Бельскім старостве і сярод радных „Нашага Падляшша", каб развіваць беларускую культуру ва ўсіх галінах. Сам староста і старшыня Рады павета прыходзяць на нашы мерапрыемствы.

Не толькі я не цешуся ☞ 4

Вяртаюся з горада і вачам не веру: пляц пад мой гараж высыпаны жоўценькім пясочкам. „Божа, як новая ўлада дбае аб чалавеку!" На другі дзень раніцай гляджу, а там ужо стаіць „бляшак" і ля яго чалавек з самаходам. Падыходжу да яго і пытаю, чаму ён паставіў гараж, калі ў мяне на гэтае месца ёсць дазвол. А ён адказвае, што таксама мае дазвол.

Чытальніцтва ў Арлянскай гміне ☞ 8

Гмінны кнігазбор сёння налічвае 11 156 адзінак, з чаго амаль тры з паловай тысячы складае дзіцячая літаратура. Сёлета ў верасні купілі 61 адзінку, у большасці — даведнікаў для карыстання на месцы, за якія заплацілі 1 005,60 зл. Штогадовы бюджэт на куплю кніжак, гэта 1 500 зл.

Ці на гэтым жыцці ўсё канчаецца? ☞ 9

У дзень 1 лістапада наведваем магілы блізкіх, запальваем на іх лампадкі і свечкі; усталяваўся добры звычай запальвання знічаў на адзінокіх магілах. У той дзень могілкі становяцца для жывых найважнейшым месцам, а ходзім туды ўсе не адно таму, што гэта свайго роду традыцыя ці абавязак — каля магіл вяртаюцца ўспаміны.

Захоўваюць старое ☞ 10

Што можна ўбачыць у школьным музеі — усяго не пералічыць. Аднаго можа зацікавіць стары посуд і хатнія прылады, другога — усё, што служыла сялянам у стадоле ды на панадворку, а яшчэ каго — пасека.

Два бакі банкаўскага білета ☞ 11

Вось такое меў я дачыненне з чалавекам, які паводле дакументаў вельмі хворы і ў дарогу павінен падавацца толькі пад здаровым наглядам. У сапраўднасці ж справа маецца інакш і такая з'ява, дзе „на розум не хварэюць", не адзіночная, але ў нашым грамадстве даволі частая, бо за ўсімі такімі ілюзіямі стаяць грошы, немалыя. Льготы і дадаткі за інваліднасць гэта адзін бок банкнота, а другі бок — тыя інвалідныя дакументы таксама не ўзяліся дармова.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Шанец на „рэанімацыю” газеты

12 кастрычніка рэдакцыю забароненай два гады таму беларускімі ўладамі газеты „Пагоня” наведалі прадстаўнікі Камісіі ЗША па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе Робэрт Мак-Намара і Арэст Дэйчакіўскі, а таксама супрацоўнік пасольства ЗША ў Беларусі Марк Нордбэрг. Тыднем раней „пагоняўцы” прымалі гасцей з Хельсінскага камітэта Швецыі на чале з генеральным сакратаром Робэртам Хардам.

Натуральна, што справа забароны гродзенскай газеты „Пагоня” ды зняволення журналістаў Міколы Маркевіча і Паўла Мажэйкі пасля сусветнага розгаласу мусіла мець нейкі працяг. Таму прадстаўнікі заходніх праваабарончых структур вельмі цікавяцца не толькі лёсам асуджаных, але ўсіх супрацоўнікаў легендарнага выдання і перспектывамі „рэанімацыі” папяровага варыянта газеты. Калі сайт „Пагоні” пасля афіцыйнай забароны выдання ўсё ж нейкі час стала аднаўляўся, дык зарэгістраваць новую газету было немагчыма з-за катэгарычнага супраціву мясцовых уладаў, якія старанна выконвалі загады з Мінска. Матывацыя адна, маўляў, на Гродзеншчыне і так хапае сродкаў масавай інфармацыі...

— Але месца забароненай „Пагоні” на мясцовым інфармацыйным рынку дагэтуль не занятае, — распавёў высокім заходнім гасцям Мікола Маркевіч. — Паўставалі і знікалі толькі новыя рэкламна-забаўляльныя выданні, якія не закранаюць грамадска-палітычныя аспекты жыцця нашага рэгіёна...

Атрымоўваецца, што беларускія ўлады не жадаюць ці баяцца паўстання беларускамоўнай грамадска-палітычнай газеты кшталту забароненай „Пагоні”. На думку Міколы Маркевіча, вельмі важным момантам для рэанімацыі незалежнага выданння з'явілася якраз захаванне асноўнага журналісцкага складу былой рэдакцыі і падрыхтоўка сайта „Пагоні”. Праўда, з-за фінансавых цяжкасцей ён нейкі час не аднаўляўся, але напрыканцы верасня зноў „ажыў”. Больш за тое, рэдакцыі ўдалося пераняць правы на выданне газеты „День”, якая дагэтуль друкавалася ў Мінску, але спыніла свой выхад. Афіцыйная рэгістрацыя „Дня” аказалася вельмі дарэчы і журналісты забароненай „Пагоні” ўлетку выдалі пад ейнай шыльдай нумар цалкам прысвечаны памяці Васіля Быкава. Але ўлады хутка зарыентаваліся ў чым справа і гвалтам спынілі выхад газеты „День”.

— Больш за месяц трэба было дамагацца, каб улады адхілілі сваё рашэнне аб спыненні рэгістрацыі „Дня”, — паведаміў прадстаўнікам Камісіі ЗША па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе Мікола Маркевіч. — Цяпер бачыцца тры варыянты існавання папяровага выдання. Першы — гэта афіцыйна друкавацца і распаўсюджвацца праз кіёскі ў Беларусі. Другі — друкавацца ў расійскім Смаленску і распаўсюджвацца праз грамадскія арганізацыі. Трэці — друкавацца ў Беластоку...

Натуральна, што самым аптымальным лічыцца першы варыянт. Але ці не будуць улады зноў ствараць перашкоды ў працы „апальных” журналістаў і ці не забароняць новапаўсталую грамадска-палітычную газету ў Гродне? На гэтае пытанне няма адназначнага адказу. Магчыма, прадстаўнікі Камісіі ЗША па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе атрымалі нейкія тлумачэнні падчас афіцыйнага візіту да старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра Саўчанкі, калі на той сустрэчы ўвогуле вялася гутарка пра свабоду слова на Беларусі.

Юры Гумянюк

Словы шчырага спачування **ЕЖЫ МАКСЫМЮКУ** з прычыны напаткаўшага Яго гора — смерці жонкі ІРЭНЫ КІР'ЯЦКАЙ — выказвае **круг паклоннікаў музыкі Яна Тарасевіча**.

Патавая сітуацыя

Чарговая сустрэча беларускага і расійскага прэзідэнтаў, як засведчылі шматлікія інфармацыйныя крыніцы, завяршылася безвынікова. Калі, натуральна, пад безвыніковасцю разумець нявырашанасць пераходу на адзіную валюту, „газавай” праблемы і так званага Канстытуцыйнага акту.

Варта адзначыць, што папрокі А. Лукашэнкі на тое, што яго нібыта не заўважаюць у Расіі альбо адмыслова замоўчваюць беларускую тэматыку цяпер ужо сэнсу мець не будуць. Беларускі лідэр цягам апошняга месяца чатыры разы з'яўляўся перад расійскай публікай з экрана тэлевізара. І кожны раз у кантэксце сустрэчы з Ул. Пуціным. Таму калі мець на мэце экспанаванне самога сябе расіянам, то беларускі прэзідэнт гэтага з поспехам дабіўся. Што ж тычыцца эканамічных выгод роднай дзяржаве ад такіх кантактаў яе кіраўніка, то тут пакуль усё наадварот. Бо ўсе ранейшыя дамоўленасці, па якіх Беларусь атрымлівала танны газ і бязвыплатныя, па сутнасці, крэдыты перастаюць мець вагу. Здавалася, што менавіта гэтыя пытанні стануць у цэнтры ўвагі пасяджэння вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы, якое адбылося 14 кастрычніка ў Маскве. Але размаўляць аб гэтым бакі аказаліся не ў стане. Прынамсі, афіцыйна. На парадку дня пасяджэння стаялі шэсць пытанняў, якія назваць прынцыповымі ў інтэграцыйным будаўніцтве вельмі цяжка. Самымі значнымі з іх падаюцца святкаванне 60-годдзя Перамогі ў Другой сусветнай вайне і ход выканання бюджэту саюзнай дзяржавы за 2003 год. Зразумела, бакі не абышлі ўвагай тое, што хвалюе іх пачынаючы з 2002 года, але — у неафіцыйнай частцы сустрэчы. Гэта значыць, ніякіх рашэнняў ні па ўвядзенню расійскага рубля ў Беларусі, ні па прыняццю Канстытуцыйнага акту, ні па пастаўках газу прымаць не планавалася ад пачатку. Не планавалася, канешне ж, расійскім бокам. Бо беларускія праўрадавыя СМІ апавясцілі аб унясенні вышэйазначаных пытанняў у парадак дня пасяджэння.

У выніку, усё што планавалася было з поспехам абмеркавана, але аб нейкім праясненні ў беларуска-расійскіх дачыненнях казаць не даводзіцца. Расійскія ўрадаўцы характарызуюць сітуацыю з Беларуссю як „патавую”, што азначае немагчымасць нейкага развіцця сітуацыі, якое б задавальняла абодва бакі.

На эканамічныя стасункі з галоўным саюзнікам расійскі прэзідэнт глядзіць праз прызму інтарэсаў Расіі. Гэтая пазіцыя цалкам укладваецца ў логіку ягоных дзеянняў на міжнароднай арэне — імкненню рознымі спосабамі ўдзельнічаць у самых разнастайных міждзяржаўных саюзах і аб'яднаннях, нават такіх, да якіх, здавалася б, Расіі няма справы. Яскравым прыкладам можа служыць імкненне Расіі стаць наглядальнікам арганізацыі Ісламскай канферэнцыі, што аб'ядноўвае мусульманскія краіны, спрабуючы выпрацаваць агульны для сваіх членаў пункт погляду на тыя ці іншыя праблемы.

Дарэчы, менавіта на гэтую падзею звярталі ўвагу ўсе без выключэння расійскія сродкі масавай інфармацыі і надавалі ёй значна большую важнасць, чым пасяджэнне вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы, дзе ягоны старшыня А. Лукашэнка даў слова для выступу іхняму прэзідэнту Ул. Пуціну. Прычыну цяперашніх прабуксовак „саюзнага будаўніцтва” тэлеканалы тлумачылі вельмі проста і даходліва. Маўляў, Аляксандра Лукашэнку больш цікавіць ягоны далейшы лёс у рамках так званай Саюзнай дзяржавы. А гэты чыннік пакуль застаецца нявырашаным і нявызначаным. Таму і дамовіцца аб валюце, Канстытуцыйным акце ці газе на даны момант не ўяўляецца магчымым.

Што ж тычыцца далейшага лёсу Беларусі сярод спрадвечных суседзяў, то ён застаецца незразумелым. З-за палітыкі самаізаляцыі краіна працягвае страчваць пазіцыі. Так, праходзіўшы амаль у тыя ж дні ў Маскве круглы стол па пытаннях аб'яднання энергасістэм краін СНД і Балтыі з Трансеўрапейскай сінхроннай электраэнергетычнай сістэмай краін Заходняй, Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы адбыўся без удзелу беларускіх прадстаўнікоў. Наведаўшы Беларусь 12 кастрычніка прэм'ер-міністр Польшчы Лешак Мілер усклаў вянкі загінуўшым салдатам Дывізіі імя Тадэвуша Касцюшкі пад вёскай Леніна, але не меў жадання сустрэцца з беларускім кіраўніцтвам.

Падаецца, што „патавая” сітуацыя склалася не толькі ў беларуска-расійскіх міжурадавых дачыненнях, а ўвогуле ў беларускага палітычнага курсу. Зразумела, рана ці позна такое становішча зменіцца. Якім чынам? Гэта ўжо іншае пытанне. Звычайна, у шахматах пасля пата гульню пачынаюць наноў. Але палітыка не шахматы. Тут трэба мяняць гульцоў.

Уладзімір Лапцэвіч

Два мільёны палякаў у Беларусі

[1 ☞ працяг]

культуры ідзе вялікая частка бюджэту горада Беластока. Немагчыма нават было спытаць адкуль у грамадзяніна Беларусі такія дакладныя інфармацыі, таму што ў час дыскусіі Кручкоўскі пакінуў публіку і выйшаў. Добра, аднак, ведаць кошт існавання беларускай меншасці. Паводле даступных матэрыялаў на беларускую культуру дзяржава штогод выдае ў сярэднім каля 900 тысяч злотых. Магчыма, астатнія 4 мільёны гэта кошт утрымання спецслужбаў прызначаных для „апекі” над нашай грамадскасцю. Калі б не было беларусаў, можна было б, зразумела, заашчадзіць такія выдаткі. А з бюджэту горада Беластока, са сродкаў прызначаных на фінансаванне культуры, у 2001 годзе беларусы атрымалі 0,03 працэнта.

Пры нагодзе свайго выступлення сакратар БГКТ Валянціна Ласкевіч звярнула ўвагу, што беластоцкія беларусы жывуць у горадзе, у якім мясцовыя палітыкі, у тым ліку і пасол Сейма, адкрыта гавораць: „Польшча толькі для палякаў”.

Доктар Кручкоўскі шмат увагі прысвяціў вызначэнню лічбы палякаў у Беларусі. Паводле перапісу ад 2000 г. польскую нацыянальнасць дэкларавала 390 тысяч грамадзян Беларусі. Зразумела, вучонаму гэта ніякі аргумент. „У Лідскім ці Воранаўскім раёнах, паводле афіцыйных даных, палякаў каля 80 працэнтаў. Але мы лічым, што іх удвая больш”, — заявіў старшыня. Невядома, памыліўся ці гаварыў сур'ёзна. Пацярпелі таксама каталіцкія святары, якія вядуць багаслужбу на беларускай мове, а асабліва Ігар Лашук з Мінска. „Народ ужо не можа сцярпець такой трасянкі”, — канстатаваў вучоны.

Слухаючы старшыню СПБ я разважаў як гэта выглядала б, калі б мы пачалі голасна крычаць, што нас у Польшчы не 48,5 тысяч, але 485 тысяч, што падчас перапісу людзі баяліся прызнавацца да свае нацыянальнасці, што чыноўнікі масава фальшавалі вынікі, дамагацца універсітэта, тэатра і іншых беларускіх устаноў, паводзіць сябе так, як братнія народы. Лёгка можна прадбачыць, якая была б рэакцыя палітыкаў, журналістаў ды шматлікіх маральных і інтэлектуальных аўтарытэтаў.

Польскі гісторык з Мінска Ежы Івашкевіч расказваў пра нацыянальную палітыку сучасных улад Беларусі. Найбольш дасканалым метадам абмяжоўвання дзейнасці нявыгадных арганізацый, — гаварыў ён — бываюць фінансавыя кантролі. Такім шляхам можна закрыць любую арганізацыю. Маючы за сабой акцыю Беластоцкай дэлегатуры НІК у „Ніве”, я прыйшоў да высновы, што метады працы „службаў” дэмакратычных і недэмакратычных рэжымаў так моцна не разыходзяцца. У адным і другім выпадку вынік можа быць падобны.

Яўген Мірановіч

Добры клімат для супрацоўніцтва

Размова з Васілём ЛЯШЧЫНСКІМ, намеснікам старшыні Рады Бельскага павета, адным з лідэраў „Бельскай кааліцыі", дырэктарам Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім.

— Амаль год Бельскім паветам кіруюць прадстаўнікі выбарчых камітэтаў „Наша Падляшша" і „Бельская кааліцыя". Як складваецца супрацоўніцтва паміж кааліцыянтамі?

— У кааліцыі добрае супрацоўніцтва. Працуем разам для дабра павета і не заўважаецца ў нас канфлікт інтарэсаў. У старостве ўзнікла ідэя, каб у першую чаргу рамантаваць дарогі ў павятовым цэнтры — Бельску, пазней з рамонтамі дарог выходзіць да гмінных цэнтраў, пасля займацца павятовымі дарогамі ў паасобныя вёскі. Мы падтрымліваем гэтую ідэю. Канешне, павятовы бюджэт сціплы. Мала грошай на асвету і ахову здароўя, а асабліва на бальніцу. Каб стабілізаваць умовы працы бельскай бальніцы і не дапускаць да празмернага росту задоўжанасці, перадалі мы ёй невялікія сродкі. Галоўная дапамога павятовых улад для шпіталя, гэта паручыцельства за крэдыт. Бальніца ў Бельску павінна працаваць згодна з сучаснымі патрабаваннямі. У справах аховы здароўя радныя „Бельскай кааліцыі" згодны з раднымі „Нашага Падляшша". А і апазіцыя ў выпадку бальніцы не галасуе шкодна.

— А якая будучыня асветы ў павеце?

— Праз некалькі гадоў трэба будзе закрываць некаторыя сярэднія школы з-за недахопу вучняў. Гэта будзе тычыцца прафесійных школ, у якіх скарачаецца набор у першыя класы. Вельмі малое зацікаўленне будаўнічымі і сельскагаспадарчымі спецыяльнасцямі. Толькі Комплекс сельскагаспадарчых школ у Рудцы павышае набор вучняў, але там вельмі добрыя ўмовы для вучобы. З павятовага бюджэту фінансавалі мы будову спартзалы пры Комплексе прафесійных школ н-р 2 у Бельску.

— У Гайнаўцы адкрылі аддзяленне Беластоцкага Політэхнічнага інстытута. Ці вы не плануеце арганізаваць у Бельску вышэйшага навучання?

— Я супраць адкрывання, што б не стала, вышэйшых установаў. Гэта паніжанне ўзроўню навучання студэнтаў. У Бельску таксама былі размовы наконт адкрыцця аддзялення вышэйшай навучальнай установы. Аднак узровень навучання ў такіх навучальных установах вельмі нізкі. Адкуль узяць навуковых супрацоўнікаў? Калі яны будуць прыязджаць з Беластока, каб дарабіць, то будуць слаба працаваць. Адкрыццё вышэйшай установы ў Гайнаўцы ненатуральнае. Калі ў Белавежы працуюць навуковыя супрацоўнікі, то там трэба вучыць студэнтаў.

— Зараз беларусы састаўляюць галоўную сілу ў „Бельскай кааліцыі". Ці ў павеце прызначаюцца сродкі на мерапрыемствы арганізаваныя беларускімі арганізацыямі?

— Сродкаў на беларускія мерапрыемствы крыху больш чым было. Ёсць добры клімат у старостве і сярод радных „Нашага Падляшша", каб развіваць беларускую культуру ва ўсіх галінах. Сам староста і старшыня Рады павета прыходзяць на нашы мерапрыемствы. Аднак прынялі мы бюджэт падрыхтаваны папярэдняй управай — мала прыхільнай у фінансавай падтрымцы.

— А які ўплыў на важнейшыя пастановы радных „Бельскай кааліцыі"?

— Каля пяцідзесяці працэнтаў. Не павінна ў нас быць змаганняў на нацыянальнай ніве. Калі справа ідзе пра пасады ў старостве, то не павінны яны раздзяляцца па нацыянальных прынцыпах. Трэба глядзець на мерытарычную падрыхтоўку і праграмы кіравання Бельскім паветам. Жывуць у нас і палякі, і беларусы. Калі мы будзем рэалізаваць інвестыцыі, то будуць яны служыць усім нацыянальнасцям.

— Зараз рыхтуеце планы на будучыню. На якія інвестыцыі хочаце выдаткоўваць самыя вялікія сродкі?

— Супольная ідэя „Нашага Падляшша" і „Бельскай кааліцыі" прадбачвае аб'язную дарогу вакол Бельска. Праз горад праходзіць вельмі важная дарога Люблін — Беласток — Сувалкі. Машыны, якія па ёй ездзяць, перашкаджаюць гарадскому транспарту і добра было б, каб гэтая дарога абыходзіла горад. Будове аб'язной дарогі можа пасадзейнічаць гранічны пераход у Полаўцах, да якога дарога вядзе праз Бельск. Сродкі на гэтую інвестыцыю прадбачваем атрымаць з еўрасаюзных фондаў.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Коматаўскія могілкі з мемарыяльным каменем аднавяскоўцам

Вёска на граніцы

Солтыса Коматаўцаў Яна Стрышко сустракаю на ягоным панадворку. Цікаўлюся пажарнай сірэнай, якая насупраць яго дома.

— Да 2000 года, — расказвае, — была ў нас пажарная каманда. Мелі мотапомпу, якую трымалі ў будынку былой школы, што стаяла на канцы вёскі. Спярша, калі ў Коматаўцах быў СКР, вазілі яе на „кулковым" трактары, а пасля то і рукамі цягалі да пажараў; найчасцей гасілі пажары лесу і палёў. Пажарная каманда раскідалася, калі войт прадаў будынак былой школы нейкай беластачанцы; тады мотапомпу забралі ў Гарадок. А сірэна асталася і яна надалей склікае вяскоўцаў у выпадку бяды і яны гасяць агонь хто чым можа.

Уласніца пасляшкольнага будынка хацела нешта ў ім рабіць, правяла туды „сілу". Але аднойчы грузавік, які вёз сасновыя штэмпелі, парваў правады. Пасля нехта ёй сказаў, што будынак ужо стары, для нічога, нават для рамонту, непрыгодны і яна яго раскідала. Цяпер дылі ляжаць на школьным пляцы і гніюць.

Калісь, пры саветах пасля вайны, у Коматаўцах быў сельсавет, пазней яго перанеслі ў Рудаву, але надалей ён называўся Коматаўскім, нават праз нейкі час пасля карэктуры дзяржаўнай мяжы. Калі Коматаўцы адышлі пад Польшчу, яны спярша апынуліся ў Крынскай гміне, а пасля перайшлі пад Гарадоцкую. Па мінулым асталася толькі тая памятка, што пошта для Коматаўцаў астаецца надалей у Крынках. І калі гмінныя чыноўнікі з Гарадка хочуць паслаць нейкую сваю пісульку ў „свае" Коматаўцы, яна, верагодна, ідзе туды праз ваяводскі Беласток, павятовую Саколку і, наканец, Крынкі.

Сёння ў Коматаўцах пражывае тры з паловай дзесяткаў чалавек; наймалодшаму каля сарака гадоў. Шмат жыхароў вёскі загінула ў час другой сусветнай вайны, бо калі Коматаўцы заняла Чырвоная Армія, усіх мужчын ад 17 да 45 гадоў прызвалі на фронт і шмат з іх, каля трыццаці чалавек, загінула. Нядаўна на коматаўскіх могілках быў устаноўлены мемарыяльны камень у іх памяць.

Крыху хат у вёсцы занепадае, а шмат служыць адно для летняга адпачынку гараджан. У адной з іх не змяшчаліся ўсе сямейнікі, яны рашылі збудаваць яшчэ адну і такім чынам у вёсцы расце новы дом. Многія гараджане ўлетку прывозяць у Коматаўцы дзяцей, якія бегаюць купацца ў Свіслач, па якой пралягае дзяржаўная мяжа. Няма там ніякай загарадзі і пагранічнікі, якія бываюць у Коматаўцах штодзённа, тлумачаць малечам, каб не выходзілі на другі бераг...

Аляксандр Вярбіцкі

Ацэнка — вельмі высокая!

[1 ☞ працяг]

— Падручнікі для навучання беларускай мовы, ва ўсіх тыпах школ, атрымоўваюць вучні бясплатна, фінансуе ўсё наша міністэрства. Калі ідзе пра абмен найнавейшай літаратурай, якая выходзіць у Рэспубліцы Беларусь, дык настаўнікі тут праяўляюць сваю ініцыятыву.

— Цяпер пра іншае. Ходзяць чуткі, што ў Гарадку, дзякуючы беларускай мове, школе ўставілі новыя вокны?

— Акон у Гарадку не зрабілі за кошт дыдактычных заняткаў. На гэтага тыпу інвестыцыі гміны атрымоўваюць мэтавыя датацыі, і іх нельга прызначыць на іншыя справы.

— Ці ў апошні час такога тыпу датацыі атрымалі іншыя школы?

— Апрача Гарадка, датацыі для меншасцей атрымала таксама школа ў Аўгустове што ў Бельскай гміне. Там датацыя мела дапамагчы ў пабудове спартыўнай залы.

— А калі ў такіх школах малое зацікаўленне мовай меншасцей?

— Тут складанасць. Найбольш залежыць ад бацькоў. Вось прывяду станоўчы прыклад з нашага горада. Бацькі дзяцей, якія зараз вучацца беларускай мове ў гімназіі н-р 7 зрабілі ўсё, каб іх дзеці працягвалі навучанне мовы, якое пачалі ўжо ў прадшколлі.

Гутарыла Ганна Кандрацюк

У новым навучальным 2003/2004 годзе беларуская мова як дадатковы прадмет выкладаецца ў 42 школах для 3 629 вучняў. Заняткі праводзяцца ў 25 пачатковых школах для 1 793 вучняў, у 15 гімназіях для 1 006 вучняў, у 2 агульнаадукацыйных ліцэях для 830 вучняў. Статыстыка прыведзена паводле інфармацыі дырэктараў школ, перададзеных каардынатару навучання моў нацыянальных меншасцей Куратoрыі асветы ў Беластоку.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Сумны канец коматаўскай школы

Трывога за беларускую мову

Я астаўся б жыць назаўсёды на Гайнаўшчыне, хоць бы і ў Махнатым, дзеля адной бульбяной кішкі, смачнай беларускай стравы. Нідзе такой няма акрамя Гайнаўкі, якая зараз з'яўляецца цалкам беларускім мястэчкам на ўскраіне Белавежскай пушчы, своеасаблівымі варотамі ў Пушчу. Палякі абурацца на такое вызначэнне Гайнаўкі, але я нікому Гайнаўку не аддаў, апрача таго што большасць жыхароў горада гэта беларусы, якія перасяліліся з навакольных вёсак. Улада ў Гайнаўцы зусім беларуская, прынамсі па паходжанні. Большасць у ёй, гэта саветызаваныя хлопцы-бэгэкатоўцы, праваслаўныя палякі, партыйныя дзеячы СЛД.

„Ніва" часта піша аб праваслаўных паляках, большасць якіх засяляе ваяводскі Беласток. Не вельмі верыў я ў такую нацыянальнасць, але гэтым летам асабіста ўдалося мне такіх сустрэць. Пытаю такога праваслаўнага паляка, якога бацькі — беларусы і жывуць у прыпушчанскай вёсцы, кім з'яўляецца ён па нацыянальнасці?

— Я — паляк. Я — праваслаўны паляк. Хаджу ў царкву. Дома, значыць, у бацькоў, гавару па-нашаму, але ж гэта не беларуская мова, — кажа.

— Як не беларуская? — пытаю. — Адкуль ведаеш, што гэта не беларуская мова?

Давялося вылажыць вельмі коратка гісторыю, нашу — беларускую. Значыць, у школе ніхто яму аб гэтым не гаварыў. Бацюшка на рэлігіі таксама не распавядаў, не гаворачы пра дом. У анкеце напісаў, што ён польскай нацыянальнасці. Жонка таксама, хоць так як і ён, мае бацькоў беларусаў. Наступнае пакаленне маіх суразмоўцаў стане ўжо карэннымі палякамі, хоць і праваслаўнымі. Так як у Беларусі беларусы стануць рускімі, як цяпер нашы людзі з Гайнаўшчыны называюць прыезджых гандляроў з Беларусі. І гэта дзякуючы нацыянальнай палітыцы прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, ці бадай што антынацыянальнай палітыцы ў дачыненні да мовы. Ці ж гэта не парадокс? У Вялікім княстве Літоўскім дзяржаўнай мовай была беларуская, хоць дзяржавы з такой назвай не было. Цяпер існуе, прынамсі фармальна, дзяржава Беларусь, а яе кіраўнік ліквідуе апошні беларускі ліцэй у сталіцы. Не магу зразумець, як можна быць прэзідэнтам Беларусі і ненавідзець усё што беларускае, акрамя фальклору, акрамя скансэну?

Лукашэнка шыкуецца кіраваць дзяржавай наступныя гады, ці нават дзесяцігоддзі, бо так народ — як ён кажа — хоча, а не як запісана ў Канстытуцыі. А вядома, што пры таталітарнай уладзе народ хоча таго, чаго хоча ўлада. І пакуль такі дагавор між уладай і народам у Беларусі існуе, і такі дагавор адпавядае народу і не пагражае суседзям, нам тут, замежным беларусам, умешвацца ва ўнутраныя справы Рэспублікі Беларусь нельга, а нават нялоўка. Пэўна, шкада, што гіне беларуская мова, беларуская культура, што ўсё будзе расійскае. Але што ж зрабіць, калі народ, які жыве на былых беларускіх землях так хоча. На гэта лякарства няма. Хоць ёсць у гэтым народзе, як сказаў Ян Новак-Езяранскі (гл. „Przekrój" № 37 (3038) ад 2003 г.) „высакаякасная апазіцыя". Апазіцыя ёсць, але сама па сабе, у таталітарным асяроддзі высокага ўзроўню інтэлекту перадаць іншым не можа. Лукашэнка ўжо пра гэта задбаў, каб голас апазіцыі да народа не трапляў. Я згаджаюся з Новакам-Езяранскім, што Польшча павінна ўспамагаць апазіцыю, не дзеля ваявання з уладай Лукашэнкі, але дзеля „разбуджвання цераз саміх беларусаў пачуцця этнічнай тоеснасці і гонару за сваю спадчыну".

На Гайнаўшчыне вялікі ўплыў на нацыянальную свядомасць яе жыхароў маюць вялікія прыхільнікі прэзідэнта Лукашэнкі і яго палітыкі, дзеячы БГКТ. Не каго іншага, толькі лідэраў гэтай арганізацыі Аляксандр Лукашэнка ўзнагароджвае за актыўную шматгадовую дзейнасць. Памагае БГКТ Лукашэнку захаваць беларускасць, ці наадварот? Цікава было б ведаць, як ставіцца БГКТ да знішчэння беларускай мовы ў Беларусі, калі ўлада ліквідуе беларускія школы?

Ад прыхільнікаў палітыкі Лукашэнкі чую, што яны палітыкай не займаюцца, найважнейшае, — кажуць, што трымае ён там дысцыпліну. Калі хтосьці не выконвае добра сваіх абавязкаў, то прэзідэнт без суда скідае яго з пасады, а ў нас, значыць, у Польшчы, справядлівасці не можна дачакацца, і што Кваснеўскі паабяцаў, што будзе лепш, а ёсць штораз горш: квітнее карупцыя, цэны растуць, прадаць збожжа не можна і г.д. Людзі, вядома, бачаць рэчаіснасць у сваім найбліжэйшым наваколлі і так яе ацэньваюць як бачаць, і такую меру прыкладаюць да рэчаіснасці ў Беларусі. У Беларусі лепшая дэмакратыя, бо там няма беспрацоўя, рабочыя атрымліваюць зарплату калі трэба, разбояў няма. А што зарплата невялічкая, то і патрэбы невялікія, што гаспадарка адстае ад гаспадаркі суседзяў і няма ўжо чым гандляваць, то простага чалавека галава не баліць; прывязе бульбу з вёскі і яксьці пражыве зіму. А летам? Якось будзе і летам, а дагаварыцца між сабою можна і па-расійску. Калі пытаю прыхільнікаў Лукашэнкаўскай дэмакратыі, ці людзі не могуць аднак гаварыць між сабою па-беларуску, то глядзяць на мяне як на нацыяналіста і папракаюць, што я нагамі лезу ў палітыку. Магу зразумець тых простых людзей, якія, апроч Лукашэнкаўскага тэлебачання, нічога не бачаць і не чытаюць, але дзеячы БГКТ, члены кіруючай партыі СЛД? Чаму вядуць такую палітыку? Каб стаць дастойным прэзідэнцкай узнагароды?

Міхал Куптэль

Вачыма паляка

Зорка з Гайнаўкі

З палаючамі шчокамі сачу ў праграме „Ідал" за кар'ерай Маргарыты Карпюк, вучаніцы матуральнага класа беларускага ліцэя ў Гайнаўцы. Вельмі ўсхваляваўся, калі ў элімінацыях заспявала яна беларускую народную песню, вядома, па-беларуску. У канкурэнцыі з амерыканскімі шлягерамі, прэзентаванымі іншымі маладымі выканаўцамі-аматарамі здавалася, што ў Малгосі няма шанцаў каб прабіцца. Ды аднак! Захапіла журы, якое аднагалосна і з захапленнем выказвалася аб яе таленце. Так, вось, дайшла яна на тае часткі элімінацый, у якой тэлегледачы рашалі аб тым, хто знойдзецца ў фінальнай дзесятцы „Ідала".

У тую нядзелю і ў той самы час, калі Малгося мела змагацца за свой уваход у фінал, у іншай тэлестанцыі арганізаваўся нацыянальны тэст на інтэлігентнасць. Кожны, хто хацеў, мог, адказваючы на пытанні праверыць сваю інтэлігентнасць, значыць, IQ. І я таксама хацеў. Але як тут падтрымліваць Маргарыту Карпюк і ў той самы час рашаць тэст! Засталося мне толькі адно. Выграбці стары партатыўны тэлевізар і глядзець і тое, і тое. На жаль, калі пачала спяваць гайнавянка, штосьці мне тое адказванне не ішло. Да таго ў тэсце паявіліся якраз пытанні звязаныя з умеласцю лагічнага мыслення. Заслухаўся я ў песню Маргарыты з мюзікла „Метро" і заглядзеўся на яе красу, грацыю, непрэтэнцыёзнасць і сціпласць, настолькі адрозніваючыя яе ад іншых выканаўцаў „Ідала". І як тут лагічна думаць і адказваць у пятнаццаць секунд на пытанні тэста?

І прапусціў я цэлую серыю пытанняў. Да таго, калі яшчэ працягваўся тэст, як мёд на маё ўсхваляванае сэрца гучалі думкі журы пасля выступлення Малгосі. Яцак Цыган, аўтар тэкстаў, хваліў:

— Можна шмат філасофствацаць, але аб тым, што мы тут пачулі, гаварыць няма патрэбы.

— Прыгожая як Клеапатра, грудзі — як метэарыты, — ацэньваў супярэчлівы спявак і паэт Мацей Маленчук.

Увесь у захапленнях быў музычны крытык Роберт Ляшчынскі, фанат „Басовішча". Шкадаваў толькі, што на гэтым этапе матурыстка з Гайнаўкі не заспявала таксама па-беларуску, як „За туманам нічога не відна". Дадаў:

— Людзі з Усходу рэвалюцыянізуюць „Ідала".

Раней стылістка Юлія Канажэўская сказала аб Маргарыце:

— Прыгожая, стройная і... сексоўная.

Найважнейшы, аднак, яе несумненны талент. Але атрыбутам Маргарыты ёсць таксама факт, што не сароміцца яна сваіх беларускіх каранёў. Больш. Яна імі ганарыцца і трактуе як козыр у агульнапольскай спробе, а, можа, і ў будучыні, і сусветнай кар'еры.

Гэты „тавар", як паказваюць выказванні членаў журы „Ідала", купляецца. І, што цікава, купіў яго г.зв. просты народ, які вырашыў, што больш за 42 працэнты галасоў здабыла яна ў гэтай частцы элімінацый і 2 лістапада выступіць у фінальнай дзесятцы. З ліку шасцёркі выканаўцаў на другую асобу, якая трапіць у фінал, Каліну Каспшык, аддалі галасы траха больш як 20 прац. слухачоў „Ідала". І гэта аб чымсьці сведчыць.

Незалежна ад таго, ці Маргарыта Карпюк стане тэлевізійнай зоркай, вядома, што ўжо ўпісваецца яна ў спісак групы творцаў у розных галінах, якія надаюць тон сусветнаму мастацкаму стылю, а адначасова ідэнтыфікуюцца з гэтай часткай Польшчы. Сярод іх Лявон Тарасэвіч, Адам Сяменчык, Маргарыта Дмітрук, не ўспамінаючы шэрагу літаратараў, ачоленага Сакратам Яновічам, на маю думку, нявыключана, што ў будучыні лаўрэатам Нобелеўскай прэміі. Цяпер пачэснае, бо медыяльна моцнае месца пачне займаць у гэтай гронцы і Маргарыта Карпюк. Адным словам: беларусы гарой!

Вернемся да тэсту на інтэлігентнасць. Падагуліў я свае пункты, якія атрымаў за рашаныя заданні. Не скажу, што выйшла, бо мае ворагі былі б задаволеныя. Ну, не геній я, але і не крэцін. Мясцовы патрыятызм, аднак, дае мне з гонарам напісаць, што Падляшша апынулася ў ліку найбольш інтэлігентных частак краіны, а Беласток быў чацвёрты пасля Варшавы, Кракава і Шчэціна. Аднак, каб было справядліва, параўнальна высокае IQ мае не само Падляшша ці Беласток, а інтэрнаўты, якіх адказы браліся пад увагу. Ва ўсёй Польшчы было іх аж — ці толькі — каля 300 тысяч.

Мацей Халадоўскі

Не толькі я не цешуся

Яшчэ адзін „справядлівы" беластачанін падаўся ў сенатары, каб рабіць Польшчу на свой капыл. Цешыцца пан Юргель перамогай, цешыцца і ягоны электарат. Толькі я не цешуся, калі ўспамінаю тыя перажыванні, калі быў ён прэзідэнтам Беластока. Тады я ўгледзеў месца пад гараж па вуліцы Вашынгтона і пайшоў у Гарадскую ўправу аформіць справу. Напісаў я заяву, заплаціў патрэбныя грошы і чакаю. Па нейкім часе даведваюся, што мая просьба аформлена ў маю карысць. Плачу яшчэ раз за афармленне дакумента і задаволены іду шукаць людзей, якія зробяць бетонную падлогу пад жалезны гараж.

Назаўтра бачу: месца пад гараж абведзенае шнурком. Думаю: „Вось гэта сапраўдная дэмакратыя. Далі дазвол і яшчэ самі пазначылі месца, каб незаконна не ўвайшоў якісьці цванік". Вяртаюся з горада і вачам не веру: пляц пад мой гараж высыпаны жоўценькім пясочкам. „Божа, як новая ўлада дбае аб чалавеку!" На другі дзень раніцай гляджу, а там ужо стаіць „бляшак" і ля яго чалавек з самаходам. Падыходжу да яго і пытаю, чаму ён паставіў гараж, калі ў мяне на гэтае месца ёсць дазвол. А грамадзянін мне адказвае, што ён таксама мае дазвол і паказвае падпісаны прэзідэнтам Юргелем дакумент. Пайшоў я да прэзідэнта і даведаўся, што на гэтае месца атрымала дазвол аж дзесяць чалавек. Прэзідэнт дазволіў, пабраў адпаведныя аплаты за афармленне спраў, а вы там пазабівайцеся — хто мацнейшы, той і пан. Усе мы сталі ворагамі адзін аднаму. Я да нікога не меў прэтэнзіі, а да мяне па сённяшні дзень не адзываецца той, з кім я загаварыў упершыню. Думае ён, што гэта я прычыніўся да таго, каб яму забралі дазвол, а далі камусьці іншаму. Я астаўся без гаража, ён трымае машыну на паркінгу, а рэшта цванікаў „падмазалі" і ... атрымалі месцы вакол спрэчнага ўчастка. Вось табе права і справядлівасць.

Мы з жонкай галасавалі на Кшыштафа Біля-Ярузельскага не таму, што ён кандыдат СЛД, а таму, што хацеў быць слугой усёй Беласточчыне. Я бачыў, як ён, шпацыруючы з дачкой па парку каля царквы, гаварыў ёй, што ў нас жывуць не толькі палякі, але і іншыя нацыі — беларусы, украінцы, расейцы, літоўцы, ромы... і ўсе яны кахаюць гэтую зямлю, працуюць на ёй і за яе ваявалі. Ідучы на выбарчы ўчастак, я запытаў некалькіх напатканых асоб, ці ўжо галасавалі і на каго. Адзін мне адказаў, што ён не будзе служыць епіскапам, другі сказаў, што хоць раз у жыцці хоча мець спакойнае сумленне і не пойдзе галасаваць на нікога, бо і так усімі ўладае Ватыкан. „Гэтыя розныя Мілеры і яму падобныя дабравольна аддалі Польшчу кліру", — махнуў ён рукой. А дзве жанчыны адказалі: „Няхай «жондзяць» без нас, бо мы за гэтым бардэлем не пойдзем". Народ проста траціць надзею.

Васіль Петручук

Літаратурна-мастацкая старонка № 523

Міра Лукша

Ярына

За сцямнелай шыбай марасіць дождж. Шыбы былі памытыя ўчора. Так як і жалюзі, падлога ў кухні і ў калідоры, белыя дзверы ў кватэру. Часу было шмат, і Манік, каб не зацямняць галавы нахабнымі ды бессэнсоўнымі думкамі, зноў быў узяўся за прыбіранне кватэры. Хата была пустая ад паўгода. Толькі новая мэбля, камп'ютэр, кнігі, сам Манік ды кот Мустафа Вусаты. Усё, што навейвала ўспаміны з жыцця тут Ярыны, Манік выкінуў. Хутчэй, каб потым не шкадаваць. Адзенне спакаваў у фольгавыя торбы і ўсунуў у кантэйнер на ўжываную вопратку для бедных, кнігі зваліў на тачкі дзядзькі Яся, які збірае макулатуру па блёках. Паперын розных было шмат — Ярыніны нататкі, запіскі, старыя календары — дзяўчына сабралася была з усім гэтым, што мела з сабою, у Манікаву хату; няшмат гэтага было, а амаль усё насіла ў сваёй ёмістай торбе. А цяпер не носіць. Не ведае Манік, дзе цяпер Ярына. Раптам знікла.

На падлозе тады засталіся чырвоныя кроплі.

Манік згарнуў са стала чарэп'е. Толькі тут ад учора не прыбраў. Манія прыбірання засталася яму ад смерці бабы Марысі. Плямкі не пакіне, звочыць кожную пылінку. Нават лісце кветак працірае, глянцуе. І рукі мые раз-пораз. Нейкі дзіўны тлушч усё склейвае яму пальцы. І пахнуць яны валасамі Ярыны. Ні то мацярдушкай, ні рамонкам. Успатнелым жаночым целам. Хоць Ярына пазбаўлялася свайго натуральнага паху, як магла. А, можа, і паху сябра. Адно ў іх было супольнае — прага празмернай чысціні. Калі б можна было, нават і не елі б, бо трэба хадзіць у туалет.

Найчысцейшая гарэлка. Спірт. Манік працірае пальцы ваткай умакнутай у горла распячатанай бутэлькі з „Ледзяной гарэлкай". Кот моршчыцца на канапе. Мустафа Вусаты не любіць, калі Манік п'е гарэлку. Калі многа п'е, забывае памяняць яму пясок. Мустафа Вусаты таксама любіць чысціню і парадак. І каб міска поўная была. Калі была Ярына, жылося і кату, і гаспадару лепш. Міска была заўсёды поўная, і таго, што кату смакавала — печанай свіной пячонкі, смажанай рыбы, паляндвіцы. Але Ярыны няма. Кот пастараўся забыцца, чым пахне яе цела. Як смакуе Ярыніна кроў на падлозе. На ўспамін хаваецца ў канапу. А там ляжыць яе блузачка, кот сам яе прыхаваў. Тады Манік матлашыў яе адзенне, упіхваў у фольгавыя кулькі, каб як найхутчэй вынесці на вуліцу. Мустафа выцягнуў шматку, хутка ўскокнуў у дзірку ў нераскладзенай канапе і засунуў блузачку, прапахлую Ярыніным целам, за падушку. Цяпер, калі яе няма, а Манік машынальна ходзіць з аднаго пакоя ў другі, кот улазіць у свой таемны схоў і аддаецца прыемнасці кантакту з небылой. І топча-перабірае шматку, быццам церабіў забыты матчын жывот.

Манік кранае тэлефонны апарат. Падымае трубку. Чуваць гудкі, хоць абанемент неаплачаны. Ужо даўно павінна гучаць з трубкі, калі хтосьці хоча сюды пазваніць, што доступ да таго абанента немагчымы. Альбо і ўвогуле павінен апарат маўчаць.

— Няма такога нумара! — Манік раптам рагоча ў трубку і кідае яе на стол.

— Як няма? — чуе сіплаваты ад цыгарэт Ярынін голас.

— А ты скуль узялася? Ты ж памерла! Не, не памерла! Ты мне ўсё на злосць робіш! Я хачу, каб ты памерла!

Тэлефон маўчыць. Нават тых гудкоў не чуваць. А чаму ж ён павінен працаваць?

Ярына ж сама насіла паперу ў Тэлекамунікацыю, бо Манік збаяўся. Не любіць ён канцтараў, бюро, чыноўнікаў. Усе справы афармлялі калісьці мама альбо бабуля. Вядома, пры яго прафесіі, калі кожны дзень мусіць кантактавацца з чужымі людзьмі, кожная хвіліна гэта пакута. Каб не балела, трэба злавацца. Ненавідзіць гэтых дурняў за пісьмовымі сталамі ў канторах, установах, міністэрствах. Пасля дзвюх гадзін напружанай нянавісці Манік мусіць напіцца. Тады лягчэе, адпускае. А дома была Ярына. Вялікая, абсыпаная нататкамі, да якой што і раз званіў тэлефон і кудысьці пасля званкоў было ёй спешна. Каб хоць займалася сваімі справамі! З торбай, з якой высыпаліся ейныя запіскі, самапіскі, аддрукаваныя электронныя лісты на розных мовах, таблеткі... Нават Мустафа Вусаты прабаваў зрабіць нейкі парадак з Ярыніным балаганам, разграбаў, заграбаючы яе скарбы назад у перакуленую торбу. А, бывала, Ярына была акуратная, і кідалася на парадкаванне Манікавай кватэры і сваіх пажыткаў. Асабліва тады, калі сябра хварэў. А здаралася яму гэта штораз часцей — раптоўная высокая гарачка, востры кашаль, боль у грудзях. Гэтак памерла баба Маня. І бацька. І мама. Усё ад цыгарэт. А, пэўна, гэта генетычная справа. Ужо прадзеды хварэлі сухотамі, цэлы род хваравекі, хоць некаторыя і да сотні дацягвалі... Манік пэрхаў у сваім пакоі, згорблены над камп'ютэрам, а Ярына заходзілася ад кашлю ў сваім, ламатала па клавіятуры свайго партатыўнага. З-пад зачыненых дзвярэй да абодвух пакояў снаваўся сівы дым. Гнеўны Мустафа лез у канапу.

Два апошнія тыдні было добра. Цішыня ў хаце. Маніку сніліся толькі добрыя сны, якія памятаў. У той раз Манік не ўставаў з ложка. Разам з кашлем з-за зубоў вырвалася крывавая макрота. Мустафа лёг на яго грудзі, выганяць хваробу. Ярына вярнулася з камандзіроўкі ўвечары. Кінула торбу на ложак. У яе вачах білася трывога — яе сны не былі добрыя і светлыя. Памыла рукі, кінулася ў кухню рыхтаваць абед.

— Каханы, ты, бачу, ад ранку нічога не еў?

Абое стараліся не ўжываць слоў пра пачуцці. Гэта было смешна.

Дзяўчына кінула на патэльню марожаную рыбу. Мустафа цёрся каля яе ног.

— Што ты робіш у маёй хаце?! — Манік у кашулі і штоніках, палаючы ад гарачкі, трымаў у руцэ кухонны нож. — Выкіну гэтую рыбу праз акно разам з патэльняй, а цябе заб'ю! Буду біць у шыю, у грудзі, у голаў! Выкіну цела за акно, і сам выскачу! Каб ты ведала, як я ненавіджу тваю цялеснасць!

Манік не памятае, што здарылася потым. На падлозе чырванела засохлая кроў. Доўга давялося яе чысціць. Раніцай не было ні Ярыны, ні яе торбы, ні яе партатыўнага камп'ютэра. З хаты, праўда, можна было ўсё вынесці — дзверы былі насцеж адчынены. Раніцай разбудзіла яго суседка, пані Гражка: на парозе кватэры стаяў страшны Мустафа.

Ярыны нідзе няма. Можа, яна з таго боку, дзе баба Маня, мама, бацька, дзед Вечаслаў? Прыходзяць яны ў сне разам да Маніка, сядяюць на канапе. Бабуля топчацца па кухні, хоча змяняць шпалеры. А Ярына ў гэтым сне ідзе за бабуляй у кухню, смажыць смярдзючую рыбу, каб накарміць свайго найлепшага сябра.

Жывапіс у галерэі „Маршанд"

У галерэі „Маршанд" у Беластоку па вул. Рынак Касцюшкі, 15, можна пабачыць плён пленэру ў Цеханоўцы, арганізаванага Беластоцкім аддзелам Саюза польскіх мастакоў (па гэтым адрасе ёсць і ягоная сядзіба). Паказваюцца жывапісныя працы м.інш. Вікторыі Талочка, Здзіслава Парчынскага, Юзафа Здзеха, Яўгена Вішнеўскага, Дароты Лабаноўскай. Якраз магістр мастацтваў Лабаноўская, апрача сваіх некалькіх карцін, адважылася выказацца наконт кандыцыі мастака ў сучаснасці:

„Мастак заўсёды належаў свайму часу, прызнаваў яго альбо яму супраціўляўся. У кожнай эпосе існуюць дзеянні, якія не маюць большага значэння. Існуюць таксама вядучыя сілы, тыя, што вырашаюць аб незнішчальных і доўгатрывалых каштоўнасцях твора. Мэту дасягаюць мастакі вялікага фармату. Патрапяць у сваім творы паказаць бляск найвышэйшых яго каштоўнасцей — тайну ўнутранага азарэння.

Успрымальніка твора мастацтва найчасцей цікавіць сам твор. У меншай ступені — жыццё і індывідуальнасць аўтара.

Бунтарская натура, цікаўнасць да свету, усебаковыя веды, паслядоўнасць у накіраванасці да мэты і тытанічная, бесперапынная праца — вось база мастака. Не жыве ён у вакууме. Ён дасканалы назіральнік і акумулятар хваляванняў і аналіз радасных і драматычных перажыванняў. Сума гэтых адчуванняў — твор.

Клімат сучаснай нам рэальнасці, на жаль, не спрыяе развіццю ніводнага з мастацтваў, таксама і развою талентаў, што вынікае з недахопу зацікаўлення творчымі асяроддзямі, асабліва прафесійнымі, з боку вырашальнікаў. Мастак, самотны ў сваіх дзеяннях, выпаўняе ролю «добрага Мікалая». Немалую частку жыцця мусіць прысвяціць працы для заробкаў — каб магчы ставараць, а пасля публікаваць плён свайго таленту. У замен, большасць з іх атрымлівае няшмат, па-за каштоўнай адукацыяй (на кошт дзяржавы) і ілюзіяй.

Тым часам дасягненні мастака залежаць у вялікай ступені ад вонкавых фактараў. Ад уласцівага зразумення яго ролі ў фармаванні нацыянальнай культуры і ад каардынавання яго творчымі дзеяннямі. Мастак, па сваёй натуры — незалежны, з неабходнасці мусіць дастасавацца да рэчаіснасці (па-за адзінкамі), у якой, з-за бяздумнасці і прасцяцкасці іншых, няма месца на творчую, годную экзістэнцыю. Ягоныя першапачатковыя мэта і лёс правальваюцца ў пропасць.

Узнікаюць незлічоныя ўрадавыя ўстановы, музеі, галерэі і да т.п. Даюць яны працу дзесяткам штатных працаўнікоў, гарантуючы ім дапушчальную экзістэнцыю. А мастак пакідаецца сабе аднаму.

Здаецца, ад XIX стагоддзя назаўсёды прапала традыцыя пераймання ролі мецэната кіраўнічымі коламі, заможнымі людзьмі і вышэйуспомненымі ўстановамі. А той галоўны вытворца культурнай маёмасці не заўважаецца ў ягоных штодзённых патрэбах.

Мастацтва і культура не могуць быць выпадкам. Азначала б гэта не толькі смерць культуры і мастацтва, але і упадак грамадства. Мастацтва і культура — не прафесія, якой можна авалодаць, набыць яе ці навучыцца. Вышэйшая адукацыя дае толькі няпоўныя веды і крыху паглыбленую мануальную спраўнасць. Рэшту здзяйсняе жыццё, якое мастак перамяняе ў твор. Мастак, як прадстаўнік свайго часу, адлюстроўвае тое што ўласцівае таму часу, і павінен адчуваць патрэбу і зразуменне ягонай культуратворчай ролі. Каб, як слуга мастацтва, мог аддаць яму сваё жыццё, талент і творы, неабходная яму падтрымка знутры.

У мастацтве няма пачынанняў старых і перажытых, ані новых лепшых ці горшых. Ёсць у ім заўжды маніфестацыя індывідуалізму.

Майстрам становіцца той, хто дасць праўдзе непрамінальную дасканаласць спосабам яму толькі ўласным.

Толькі тады важнасць і вялікасць творчай формулы можа быць прызнанай і трываць пакаленнямі". (куша)

Гісторыя белавежскай сям'і

Даўно не чытаў я такой асабістай і шчырай кнігі, як *Dzieje białowieskiej rodziny* Вольгі Шуркоўскай. Аўтарка расказвае аб сабе, сваёй сям'і і людзях напатканых у час жыццёвай дарогі, звычайных штодзённых перажываннях, уплеценых у гістарычны кантэкст, пачаўшы ад царскіх візітаў у Белавежскую пушчу, праз міжваенны перыяд, II сусветную вайну (савецкі і нямецкі час) і ненайпрасцейшы паваенны час. Лёсы народжанай у вёсцы Падаляны на Белавежскай паляне Вольгі Шуркоўскай з роду Руско звязаны былі з Белавежай і яе ваколіцамі. Не забыла аб іх ніколі, нават калі давялося ёй жыць і працаваць у Варшаве. „Аўтарка цікава і ярка прадстаўляе сваю жыццёвую дарогу, расказвае аб сапраўдных здарэннях, а яе біяграфія ўкладваецца ў закрыты і выразна арганізаваны сюжэт, дэтэрмінаваны бегам жыцця аўтаркі і яе псіхічнымі адрозненнямі ды станам духа, а ўспаміны — вытворныя ад іх", — напісаў ва ўступе прафесар Базыль Белаказовіч.

Кніга складаецца з пяці раздзелаў, загалоўкі якіх выводзяцца ад імён найбліжэйшых аўтарцы, але ёсць і ад яе імя. Найбольш хвалююць імпрэсіі аб дзядулі Антону; яны, як падкрэслівае праф. Белаказовіч, прасякнутыя лірызмам, у іх змешчаны сямейныя пераказы аб гэтым незвычайным чалавеку, што кахаў лес, дасканала разумеў яго шолах, вандраваў па ім свабодна ў любую пару дня і ночы і прыгадвае таленавітых сялян з апавяданняў Івана Тургенева. Вось фрагмент хвалюючага і красамоўнага ўспаміну ды таленту Вольгі Шуркоўскай:

„Я любіла назіраць за дзедам, як вастрыў касу. Рабіў гэта вельмі старанліва. Відаць было, што ў дзеянне ўкладвае не толькі высілак, але і частку свае душы. Сур'ёзна надзяваў акуляры і сядаў на пянёчку пад хатай. Другі, крыху вышэйшы пянёк, з убітай бабкай, ставіў між калені і кляпаў касу, знятую з касіска. Аднойчы выпала яму з акуляраў адно шкельца, але, выразна, не перашкаджала гэта яму ў працы. Праз нейкі час пабілася і другое. Дзедка і з гэтай стратай пагадзіўся. Усё ж, да свайго канца закладваў да сур'ёзнай работы ў гаспадарцы акуляры без шкельцаў". Гэта адна са спроб увекавечання ўспамінаў, якія адлятаюць з часам, а час часом накладваюцца адзін на адзін, як апісваны Вольгай Шуркоўскай свет.

Шмат месца прысвячае аўтарка настаўнікам, якія мелі ўплыў на яе жыццё (пазнейшага настаўніка і педагога). Што і раз вяртаецца постаць брата, з якім выхоўвалася — Барыса Руско, вядомага і вельмі плённага паэта. У раздзеле, азагалоўленым сваім імем аўтарка піша аб браце з варшаўскага студэнцкага часу: „Барыс быў цудоўным апекуном, гарантаваў маё ўтрыманне. Пільна, як бацька, сачыў за маімі знаёмствамі і ўводзіў мяне ў сваю кампанію".

У *Dziejach białowieskiej rodziny* знойдзем таксама здымкі з сямейнага альбома, якія дасканала дапаўняюць увекавечаныя словам успаміны. Шчырасць і эмацыйнасць гэтых мемуарных прызнанняў уплываюць на тое, што ёсць яны быццам шэрагам міні-апавяданнейкаў, з якіх кожнае магло б быць асобнай абшырнай гісторыяй, а ўсе складваюцца ў амаль фільмавы, каляровы сцэнарый, па словах праф. Белаказовіча, з няўлоўнай і стрыманай таемнасцю, незвычайным настроем і чароўнай атмасферай, знянацку захапляючай першабытнасцю, прывабнасцю былога і мінулых здарэнняў. (холм)

Зорка

старонка для дзяцей

Бася і Адам

— Задумы? Ёсць у нас дзве такія асобы ад замыслаў! — кажуць настаўнікі з Дубіч-Царкоўных. Ідзе тут пра Басю Трафімюк і Адама Бурачука — гімназістаў-трэцякласнікаў. Дзякуючы ім ствараюць тут жывыя спектаклі і пастаноўкі, героі якіх размаўляюць „па-свойму" — на падляшскай гаворцы. Яны завадатары ўсіх беларускіх імпрэз, усіх акцый, якімі жыве школа.

Бася і Адам родам з Грабаўца. Абое вылучаюцца глыбокім разуменнем свету, жывой інтэлігентнасцю. Умеюць крытычна назіраць за сваімі сябрамі і бацькамі, аднесціся да свету тэлебачання і Інтэрнэту. Вясковасць не з'яўляецца для іх горбам комплексаў — наадварот. Спагада і любоў да роднага вучыць разумення свету. Яны — верныя чытачы „Нівы" і „Зоркі".

— А дзе далей хочаце вучыцца? — пытаю, хаця ведаю адказ.

— Вядома, — заяўляюць, — пойдзем у беларускі ліцэй.

Зараз у Дубічах рыхтуюцца да беларускага турніру, які ў палове лістапада г.г. будзе праходзіць у бельскай „тройцы". Апрача ведаў з галіны літаратуры, гісторыі і геаграфіі, школьнікам трэба паказаць тутэйшыя каштоўнасці — мову, песні, кулінарныя смакоцці і... саміх сябе!

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Бася і Адам ужо думаюць як паказацца ў Бельску. І як уцягнуць у гульню сваіх сяброў, якім не заўсёды цікавы тутэйшы свет і наша штодзённае жыццё. ЗОРКА

Вершы Віктара Шведа

Баюся

Да бабулі нечакана
Унук малы звярнуўся:
— Хацеў бы даць табе банана
Ды крышачку баюся.

— Баяцца ты зусім не мусіш,
Унучак мой прыгожы.
— Бабуля, я таго баюся,
Што ўзяць ты раптам можаш.

Дамашняя свіння

Настаўнік у класе
Спытаў Леваня:
— Адкуль узялася
Дамашняя свіння?

— Гэта ж дзік спрадвеку,
З мінуўшчыны сівой.
У сужыцці з чалавекам
Стаўся ён свіннёй.

Станіслаў Шушкевіч

Лістапад

Пэўна, сонца знебылося,
Адпачыць пайшло за хмары,
І паўзе павольна восень
Праз іржышчы і папары.
І ад холаду рабіна
Чырванее, нізка гнецца.
Паляцелі гусі клінам,
Каб у выраі пагрэцца.
Сыплюць лісцікі бярозы,
Стала ветрана і суха —
Недалёка ўжо марозы,
Люты вецер, завіруха.

Нінка

— „Што было, калі пагасла святло"? — на пытанне, следам аўтаркі Еўдакіі Лось, паспрабавала распавесці нам Нінка Ваўранюк. Яшчэ ў дарозе ў Нараўку мы згаварыліся пра спосабы падрыхтоўкі выступлення.

— А ці вывучыла ты верш пры пагашаным святле? — пытаем Нінку.

— Баюся, калі цёмна! — адказала дрыготкім голасам дэкламатарка.

Таксама ў час выступлення беластоцкая другакласніца тэатральна перадала таемны і страшнаваты клімат верша, які спалучыўся з сімпатычным выкананнем. ЗОРКА

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Кот Кіпцюровіч

Жыў сабе кот Кіпцюровіч. Жыў ён сам па сабе і нікога не слухаў. Такія ўсе каты, а род Кіпцюровічаў асабліва хадзіў сваімі дарогамі. Кот Маркіз Кіпцюровіч пакуль яшчэ не ажаніўся, дык тым больш быў свабодны. Яму нават здавалася час ад часу, што ён не кот, а, напрыклад, заякот, бо меў ён кароткі хвост. Страціў яго ловячы пацукоў. Або, здавалася кату, што калі ў яго імя Маркіз, дык ён сапраўдны маркіз, і тады хадзіў на дзвюх лапах, размахваў хвастом як капелюшом. Усе каты думалі пра Кіпцюровіча што хацелі, бо каты маюць на гэта права, думаць як хацець.

Рашыў урэшце Маркіз Кіпцюровіч ажаніцца. Кату, каб ажаніцца, таксама трэба кагосьці пакахаць. Дык закахаўся ён зусім неўпапад. У мышку Пік-Пік. Мышка Пік-Пік была з Мінска, да таго яна была ў кніжцы.

Рашыў кот Кіпцюровіч або паехаць у Мінск, або выслаць ёй электронны ліст. Бо ж гэтая мышка была віртуальная. А віртуальнае каханне, як і кожнае іншае — незвычайнае.

За мяжу кот Кіпцюровіч не паехаў, бо не далі яму пашпарта. На здымку ў пашпарт трэба мець адслоненае левае вуха. А ў ката Кіпцюровіча левае вуха было абвіслае. А пашпарт меў бы Кіпцюровіч дарма — грамадзянам да 16 гадоў за пашпарт не трэба плаціць.

Рашыў паехаць Маркіз Кіпцюровіч са студэнтам у Мінск. Запакаваўся ў рукзак. На мяжы сядзеў ціха, і так паехаў у Беларусь. У Мінску не мог знайсці мышку Пік-Пік — забыўся адрас. Дык жыве цяпер у інтэрнаце разам з тараканамі і вучыцца размаўляць па-руску.

Радаслаў Мацієвіч, III „а" кл. ПШ н-р 6 у Беластоку (вылучэнне ў Агульнапольскім конкурсе беларускай паэзіі і прозы)

Ніна Мацяш

Багоўка

Што за кароўка такая? —
Не мукае, не рыкае,
З двума рожкамі,
а не бадаецца,
З шасцю ножкамі,
а не брыкаецца,
І малака не дае,
Затое з вялікай ахвотаю
На пашу не ходзіць, а лётае,
Бо крылы ёсць у яе.
Пацеха, а не кароўка!
Як клічуць яе? —
Багоўка!

Зорачкі

Маленькі хлопчык глядзеў, як з неба да яго ляцела зорачка. Стаяла ноч і бацькі думалі, што іх сын даўно ўжо спіць. Хлопчыку было толькі некалькі месяцаў і яго матуля легла побач, праспявала яму калыханку, а потым і сама заснула, бо вельмі стамілася. Зорачка заляцела ў пакой і зашаптала:

— Міленькі хлопчык, я — зорачка твайго жыцця. Сёння ў цябе свята, і не толькі ў цябе. У той дзень, калі ты нарадзіўся, з'явілася на свет шмат хлопчыкаў і дзяўчынак. Паляцелі, я пазнаёмлю цябе з імі.

Хлопчык ціха засмяяўся, пацягнуўся да зорачкі, і не прайшло некалькі імгненняў, як ён разам са сваёй спадарожніцай узняўся ў неба.

— Агу, — паспрабаваў спытаць хлопчык.

— Далёка-далёка, куды прылятаюць усе дзеці свету, — адказала зорачка.

— Агу, — працягваў хлопчык. — Гу-гу-гу.

— Не, не хвалюйся. Матуля не заўважыць, што цябе сёння не было дома.

Зорачка паслухала новае пытанне, якое людзі не зразумелі б, і адказала:

— Я? Я — зорачка. Я нарадзілася ў той жа дзень, калі і ты, і памру разам з табою. Бачыш? Паглядзі... Я вельмі маленькая, бо і ты маленькі, а калі вырасцеш, то і я стану вя-

Мяжа

Дала мама Анютцы і Касі свой загон у агародзе. Дачакаліся! І вясной падзялілі яго пароўну. Пасярэдзіне паставілі калочак: вось, мяжа. Кожная будзе займацца сваёй паловай. Загончык невялікі, не зараў яго дзядзька Мікола плугам, і трэба было брацца за рыдлёўку ды матычкі. Ды хутка кінулі прылады дзяўчаткі — патаміліся. Працу кончыла за іх мама. Ды сеялі ўжо яны самі: парабілі радочкі, насыпалі з торбачак насенне, засыпалі... На палачкі начапілі торбачкі, каб было відаць, што пасеена, пакуль вырасце. А сеялі і моркву, і пятрушку, і пастарнак, і кроп, і цыбулю... Фасолю, гарох, гуркі... І настуркі ды наготкі, каб прыгожа было. Калі вылузваецца ўсё з зямлі — пакуль што ўсё на сябе падобнае, а падрасце — па лісточках пазнаць можна, дзе гарох, дзе морквачка... Ды разам з усім гэтым расце лебяда ды макрыца... І іншае пустазелле, якому з вясной таксама хочацца расці, гнацца да сонца. А і густа пасеяная гародніна распіхаецца, кожнае каліва б'ецца за доступ да святла і ўрадлівай глебы.

Палоць, значыць, трэба. І перарываць. Узялася Анютка за сваю палову градкі. Прапалола роўна да калочка на „мяжы". Згіналася, карпела над зелянінай — прарэдзіла радочкі. Вырванае зелле занесла ў скрынку, на кампост. А Кася ў той час гуляла на камп'ютэры: няма чаго спяшацца гаспадару — у яго само расце. Улезла праз два тыдні на градку — і не разабрацца, дзе гародніна, дзе пустазелле, усё пераплялося. Зматлашыла ўсё абы-як. Таксама да калочка на мяжы.

Анютка амаль штодзень заглядала на загон. Палівала, рвала зелле, узварушвала глебу. Роўна да мяжы. Ды сэрца балела гледзячы на буяючае зелле на другой частцы загончыка. Вырвала памежны калочак, занялася Касінай градкай.

— А дзе мой калочак?! — узлавалася пад восень старэйшая сястра.

— І калочка няма, і плён увесь мой! — адказала Анютка.

Міра Лукша

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Выступаюць вучаніцы VIII класа Беластоцкага балетнага цэнтра ў Беластоку

Марлена

Сярод любімых аўтараў наймалодшых дэкламатараў пачэснае месца займае Васіль Вітка. Дзецям, як і публіцы, падабаецца жартаўлівы і інтэлігентны характар вершаў, якія прапануе пісьменнік.

Марленка Леанюк з бельскай „тройкі" падабрала верш пад загалоўкам „Нос". Дзяўчынка па-акцёрску ды ўражліва выступіла на сцэне Нарваўскага дома культуры. Выступленне Марлены дацанілі сябры, якія не шкадавалі апладысментаў...

Зорка

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Польска-беларуская крыжаванка № 44

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 40: Гаспадар, хорам, дрот, Заір, бровы, рэдактар, кава, гоні, танец, кадук. Год, брат, дрэва, Родан, ахова, дотык, ар, развага, мат, род, ну, баравік.

Узнагароды — запісныя кніжкі — выйгралі: **Паўліна Чурак** і **Пётр Герасімюк** з Арэшкава, **Агнешка Андраюк**, **Ева Казлоўская** і **Ева Кірылюк** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!

Вясёлы куточак

— Што сваім кшталтам нагадвае Італія?

— Гумавы бот.

— Правільна, што бот, але чаму гумавы?

— Бо ён стаіць у вадзе.

* * *

Янка хваліцца браціку:

— Навесну палова вучняў у нашым класе робіць прагул, а палова прыходзіць у школу. А як у цябе?

— У маім класе наадварот.

* * *

Янка ўручае бабулі прыгожы букет кветак.

— Навошта ж ты купляў такія дарагія кветкі? — папракае ўнука бабуля. — У нашым агародзе растуць такія ж...

— Раслі, бабулька, раслі.

* * *

— Тваё апавяданне пра сабаку, — звяртаецца да Янкі настаўніца, — дакладна такое самае, як і твайго брата, што вучыўся два гады раней. Чым можаш гэта патлумачыць?

— Гэта проста: у нас усё яшчэ той самы сабачка.

* * *

У час пешаходнай экскурсіі настаўнік пытае вучняў:

— У якім напрамку цяпер ідзем?

— На поўдзень, — адказвае Янка.

— Выдатна! А адкуль ты пра гэта здагадаўся?

— Бо робіцца штораз цяплей.

лікай і вельмі прыкметнай на небе. А ты тут, на зямлі, станеш вядомым чалавекам. Я так жадаю.

Потым хлопчык апынуўся ў прыгожым пакоі, дзе было шмат маленькіх дзяцей. Яны таксама на ўсё глядзелі з цікавасцю, і над кожным зіхацела прыгожая зорачка. Маленькі хлопчык засмяяўся і пачаў гуляць са званочкамі. Званочкі сталі перашэптвацца, а потым загаварылі:

— Ма... ма... — паўтараў адзін.

— Ма... ма... — паўтараў другі.

— Ту... ту... — паўтараў трэці.

— Ля... ля... — паўтараў чацвёрты.

І хлопчык пачаў паўтараць услед за імі: „Мама..." Прыгожае, жывое і цёплае слова. Аднойчы ён прамовіць яго, і жанчына-маці будзе цалаваць яго ад шчасця... Матуля. Мама. Званочкі змоўклі, і загаварыла зорачка:

— Ты забудзеш усё, што тут бачыў, але гэтае падарожжа прынясе табе шчасце. Шчасце сказаць першае слова і шчасце стаць добрым чалавекам. Я буду глядзець на цябе з неба, і мне будзе вельмі сумна, калі ты зробіш нешта дрэннае. Паглядзі, гэтыя маленькія кветачкі гавораць штосьці сваёй мовай тваёй суседцы. Вось і да цябе яны ідуць.

— Хлопчык, выберы, просім цябе, сваю любімую кветку. Твой выбар зробіць твой характар, — сказалі кветкі.

— Агу, — згадзіўся хлопчык і ўзяў нарцыс. Кветкі зашалясцелі:

— Вой! Перад намі вучоны. Можа, нават вялікі вучоны.

Затым да яго падплылі дываны. Яны былі рознакаляровыя. Хлопчык правёў далонню па іхняй шурпатай паверхні.

— Тваё жыццё будзе неспакойным, — сказалі дываны і зніклі.

Падпаўзла кніга. Яна ціха шалясцела сваімі старонкамі. Хлопчык дакрануўся да адной са старонак, і кніга прамовіла:

— А далей усё пазнаеш сам, бо гэта тваё жыццё і яго ладзіць павінен ты, а не мы — дапаможнікі. Да пабачэння.

— Так, мілы хлопчык, час вяртацца дадому, — шапнула зорачка, і хлопчык зноў разам са сваёй спадарожніцай узняўся ў паветра.

А пасля, ужо лежачы ў калысцы, хлопчык падняў руку, памахаў зорачцы на развітанне і заснуў, каб потым прачнуцца вясёлым як ніколі.

А зорачка паляцела на неба. Яна была шчаслівая ад сустрэчы з хлопчыкам. Зорачка легла на неба, паклала ручкі пад галоўку і пачала глядзець на зямлю, на дом, дзе жыве яе хлопчык. Пасля яна паглядзела на суседнія зорачкі. Яны пільна сачылі за сваімі сябрамі-людзьмі, і некаторыя былі вельмі старыя, а некаторыя, як і яна, толькі нядаўна нарадзіліся. І было ў зорачкі адно-адзінае жаданне: каб гэтых „народжаных" зорак было як мага больш.

Іра Красоўская,
г. Мінск, гімназія-каледж № 24

— Выйдзе Стэфан, аддасце яму за ягоную крыўду! — маці Міхала і Стэфана не даруе другому сыну ды нявестцы за тое, што ўнукаў не мае.

У блёку за сцяной

Міхалу і Еве Квяткоўскім малых сваякоў суд таксама не аддасць. Бо баяцца іх узяць. Яны — абое інваліды сярэдняга ўзросту. А Стэфан з бацькамі жыве ў суседнім мікрараёне. Не жыве, бо арыштаваны. Арыштавана і ягоная жонка Марыя. А двухгадовы Адась і васьмімесячны Каміль, калі іх падлячылі ў Дзіцячай клінічнай бальніцы ў Беластоку, знайшлі месца ў Доме малога дзіцяці па вуліцы Свярковай. А дзеду з бабай унукаў не пакінуць. Як сказаў участковы, яны ўсе — паталагічная сям'я. Праўда, пра алкагалізм старых ніхто не кажа. Канстанцін Квяткоўскі піў не больш і не менш ад іншых, жонку ягоную Пелагею кожную нядзелю ў Фарным касцёле можна ўбачыць. Не горшыя суседзі ад іншых. Гэта малодшы іхны сын Стэфан час ад часу не даваў спаць суседзям. Але дома біў паціху. Кабеты не маглі ў гэтай хаце слова сказаць. Ні маці, ні жонка. А калі былі разборкі, дык паміж мужыкамі. Стэфан, калі не падабалася, з нажом бегаў па пакоях за бацькам. Што тут кабетам умешвацца! Тым больш, што ўзяў Марыську з дыскатэкі — якіх там дзявок знайсці можна! Зараз і зацяжарыла. Нарадзіла. Не працавала ніколі. А грошы адкуль узяць? У маткі таксама пенсіі няма. Толькі стары мае грош. А вазьмі ты ўтрымайся ў пяць, а пасля ў шэсць асоб з аднае пенсіі? Да таго ўсе на купе, абіваюцца адзін аб аднаго па двух пакоях. З нерваў не выйдзеш?..

А найбольш нерваваў Стэфана яго першародны. Ну, бо ці так можа быць, што ў першую ноч заскочыш з паненкай? Не адну меў, а такое яму трапілася першы раз у ягоным дваццаціпаругадовым жыцці. Ажаніўся, дык сядзі ціха, кабета. А тая хоча каб што лепшае з'есці, каб куды выбрацца. Сядзі ў хаце! Не чапляйся! А тут і другі сын нарадзіўся. Выйшаў з нерваў зусім Стэфан: што за котную авечку ўзяў! У хаце не сцярпець. Малы плача, а і старэйшы раве. Не яго сын, пэўна, рыжаваты, а ж і Стэфан, і жонка — абое бландзіністыя. Малы ўрэдны. Усюды лезе. Калі малога не б'еш, не вырасце з яго мужык. А па-польску файна як гучыць, слухайце: *Jak kobity nie bijesz, to jej wątroba gnije!*

Суседзі не пойдуць у паліцыю ці ў суд, пачуўшы крык і енкі за сцяной. Каб пасля цягалі па судах?! А калі і нават павядоміш — што гэта дасць? Сямейная справа! — адмахваецца паліцыя. На інтэрвенцыі не хочацца нікому ехаць. Бывае, прыедуць, ката ўціхамірацъ або забяруць у выцвярэзнік, а пабітая жонка просіцца: не забірайце, хай будзе бацька дзецям. Хоць абы-які, абы быў... А пакараюць, пасадзяць — вернецца. І жонцы ўдасць, і суседзям не абыдзецца. Нават калі сямейнага ката прысудзяць на эксмісію з хаты, жыве ён там прыпяваючы, далей псіхічна катуючы сям'ю. Бывае, што доўгія гады пасля разводу...

Дык і тут, на пасёлку Бэма, суседзі маўчалі, чуючы страшны крык дзіцяці. Стэфан помсціўся на Адасю за сваё „змарнаванае жыццё". За беспрацоўе, за бяздарную ды „не разумеючую" яго жонку, за старых „пердуноў, якім ужо пара ў магілу". За тое, што той рыжы. За тое, што хоча гуляць з маленькім братам. Падаў быў Адась бразготку браціку, дык тая цацка прызямлілася на яго чэрапе. З размахам ды фантазіяй біў бацька малога. Не трапіў у яго — даставалася Марысьцы. Суседзі не рэагавалі. Швагерка Ева, што пражывае з мужам па вуліцы Вясёлай, спалоханая прыходзіла да суседкі-журналісткі: што рабіць? Да куратараў ісці? У паліцыю? Яны, Ева з Міхалам, інваліды — сілы ў іх ніякай няма, ды і невучоныя яны. Тут разумнейшых, хітрэйшых трэба. І каб суседзі што сказалі. А то на іх будзе, што данеслі, і брат будзе помсціць... А яшчэ скажуць, што да беларусаў па параду ходзіць, сябруе з імі.

Сцяпан прывёз пабітага старэйшага сына ў Дзіцячую клініку. Упаў малы на талеркі — паведаміў, параніў галоўку. Лекар спачатку паверыў, але, убачыўшы, з якім лякам хлопчык шарахнуўся ад бацькі, зразумеў, што вінаваты тут не посуд. Агледзіны ўсяго цела двухгадовага дзіцяці паказалі, што катуецца ён здаўна. Лекар паведаміў пракурора...

— Бяжы ў бальніцу, забірай дзяцей! — пазваніла Ева швагерцы. — Ты невінаватая, і ён цябе біў! Украдзі іх, схавайся ў манашак. Стэфан арыштаваны, не будзе мець руху. Дасі сабе рады неяк!

Марыя як атрупянелая чакала на развой падзей. Меншага сына забралі ў Дом малога дзіцяці, да яго далучыўся Адась. Стэфан апынуўся ў арышце на суседняй вуліцы. Арыштавалі і маці. Затое пачалі дзейнічаць дзед з бабай. Абабеглі ўсіх суседзяў, загадваючы маўчанне. І перш за ўсё пачаліся тэлефоны да Міхала і Евы: нашто сямейнае смецце вывалакалі перад чужых?! Пасадзіў брата родны брат! Тым больш злуецца Пелагея Квяткоўская, што яе родных унукаў хоча суд аддаць не ёй, бабулі, а прапануе далейшай сям'і. Перш за ўсё бяздзетным дзядзьку з цёткай. І хацелі б тыя заапекавацца малымі, ды страх паралізуе іх дзеянні. Не спяць начамі — нават у тры гадзіны ночы можа іх турбаваць неспакойная за лёс сваіх унукаў бабуля Пелася і пагражаць, што выйдзе Стэфан з турмы, дык палічыцца з імі. Як належыцца. Бо сям'я ёсць сям'я.

Лукаш Правасуд

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Гражына Насковіч за працай

Чытальніцтва ў Арлянскай гміне

У Гміннай публічнай бібліятэцы ў Орлі ў жніўні і часткова ў верасні была праведзена інвентарызацыя. Знята з уліку 841 кніга. На складзе бескарысна стаяць на полках 6 183 кніжкі з бібліятэчнай філіі былой школы ў Малінніках.

Інвентарызацыя праводзіцца кожныя шэсць гадоў з мэтай фіксацыі бракаў і адбору ўстарэлых і знішчаных кніжак. Сярод знятых з уліку 841 кніжкі найбольш было старых выданняў з сельскагаспадарчым і гістарычным зместам ды каля чвэрці старых руска- і беларускамоўных.

У Гміннай бібліятэцы сёння 11 156 адзінак, з чаго амаль тры з паловай тысячы складае дзіцячая літаратура. Сёлета ў верасні купілі 61 адзінку, у большасці — даведнікаў для карыстання на месцы, за якія заплацілі 1 005,60 зл. Штогадовы бюджэт на куплю кніжак, гэта 1 500 злотаў; столькі ж было і ў мінулым годзе. З купляй патрэбных бібліятэцы кніжак клопату няма.

Ад двух-трох гадоў па прапанове бібліятэкаркі Гражыны Насковіч, якая ў арлянскай бібліятэцы працуе ўжо 18 гадоў, чытачы могуць бясплатна перадаваць у бібліятэку непатрэбныя ўжо ім кніжкі. Дагэтуль найбольш кніжак падарыла Ірэна Пішчатоўская — 114 кніжак выдавецтва „Harlequin", Анна Шайкоўская падарыла 8 кніжак і некалькі асоб прынеслі па адной кніжцы. Кніжкі прыносяць таксама дзеці, асабліва вучні I і II класаў гімназіі, за што атрымліваюць балы (адзін за адну кніжку), якія пасля ўлічваюцца ў ацэнку іх паводзін.

Бібліятэка падпісвае чатыры выданні: „Poradnik Bibliotekarza", „Cogito", „Kurier Poranny" і „Pani Domu". Гмінная бібліятэка працуе ў сыраватым падвале новай школы — разам са школьнай бібліятэкай; у апошняй можна пачытаць „Ніву" і „Czasopis".

У канцы чэрвеня г.г. у арлянскай гміннай бібліятэцы былі зарэгістраваны 184 чытачы (на 10 больш чым у 1999 годзе), у тым ліку 74 школьнікі ва ўзросце да 14 гадоў (у 1999 годзе было іх 112). У першай палове гэтага года гмінную бібліятэку наведала 1 149 асоб (у 1999 годзе — 1 389), якія пазычылі 4 068 кніжак (у 1998 годзе 4 393 за дзесяць месяцаў і ў 1999 годзе 3 060 за шэсць месяцаў), у тым ліку 1 387 кніжак для дарослых, 1 991 — дзіцячай літаратуры і 700 — папулярна-навуковай. Сярод дарослых чытачоў найбольш пазычаюць Пётр Антыховіч са Шчытоў-Навадвораў, Анна Мартыновіч з Кашалёў, Валянціна Вітошка, Лявон Байка, Зыгмунт Кулеша і Ян Леанюк з Орлі ды іншыя.

* * *

З ліквідаванай у 2002 годзе школы ў Малінніках у Орлю трапілі 6 183 кнігі, але паколькі гэта такія ж кнігі, што і ў Орлі, стаяць яны бескарысна на складзе.

Яшчэ да 1990 года ў Арлянскай гміне, апрача школьнай філіі ў Малінніках і публічнай у Градалях, дзейнічала шэсць бібліятэчных пунктаў — у Кошках, Дыдулях, Рыгораўцах, Малінніках, Тапчыкалах і Москаўцах. У 1990 годзе філія ў Градалях і ўсе бібліятэчныя пункты былі ліквідаваны, а кнігі адтуль трапілі ў школьную бібліятэку ў Малінніках. Год назад закрылі школу ў Малінніках, кнігі прывезлі ў Орлю, а тут яны аказаліся непатрэбнымі. У гэты час жыхары заходняй часткі гміны пазбаўлены магчымасці карыстацца бібліятэчнымі паслугамі; на ўсю гміну працуюць толькі дзве бібліятэкі ў Орлі: школьная і гмінная публічная.

Міхал Мінцэвіч

Завяршэнне летніх гарадскіх фэстаў

У час канцэрта, арганізаванага 5 кастрычніка ў Гайнаўскім доме культуры, выступілі мясцовыя і запрошаныя калектывы. Мерапрыемства мела адбыцца перад магістратам, але з-за дажджлівага надвор'я было перанесена ў дом культуры. Першай спявала Марта Грэдаль з калектывам „Гадэк". Члены Калектыву песні і народнаых танцаў выступілі ў белых уборах і паказалі традыцыйныя танцы, а ўдзельнікі танцавальнага калектыву „Ілюзія" — сучасныя. Астатнія паказаліся ў чорнай і каляровай, індывідуальна праектаванай, вопратцы. Івона Вуйцік, якая выступала ў тэлепраграме „Ідал", спявала сола. Выступленні завяршыў Анджэй Рыбінскі.

— Я танцую ўжо восем гадоў, — заявіла белліцэістка Магдаліна Вішнеўская.

У калектыве з народнымі танцамі выступаюць іншыя белліцэісты. Члены калектыву „Ілюзія" толькі раніцай вярнуліся з рэпетыцый у асяродку непадалёк Семяноўскага вадасховішча. Мерапрыемства, якое было завяршэннем летніх гарадскіх фэстаў, сабрала шмат дзяцей. Прыйшлі яны паслухаць музыку. Бацькам найбольш спадабаліся народныя танцы.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Члены танцавальнага калектыву выступілі ў традыцыйных белых уборах

Ці на гэтым жыцці ўсё канчаецца?

У дзень 1 лістапада наведваем магілы блізкіх, запальваем на іх лампадкі і свечкі; усталяваўся добры звычай запальвання знічаў на адзінокіх магілах. У той дзень могілкі становяцца для жывых найважнейшым месцам, а ходзім туды ўсе не адно таму, што гэта свайго роду традыцыя ці абавязак — каля магіл вяртаюцца ўспаміны. У такі дзень найлепш усведамляем сабе, як многа мы абавязаны людзям, якіх сярод нас ужо няма. Гэта дзень роздумаў над нашым жыццём і таксама дзень надзеі, калі можам звяртацца да нашых пакойнікаў. У смерці няма нічога з пачуцця прыгнечанасці — на могілках крыжы паказваюць напрамак нашай дарогі ў неба, а святло, якое запальваем, з'яўляецца прадаўжэннем святла нашага жыцця. Смерць, гэта толькі брама, праз якую пераходзім з гэтага свету да Бога.

На штодзень не адзін дарослы чалавек ставіць пытанне: ці на гэтым жыцці ўсё канчаецца? Біблія паказвае, што не, бо заахвочвае нас да цвёрдага захавання пачатага жыцця да канца (Яўр. 3:14). Згодна Божаму намеру пры стварэнні чалавека большасць людзей дасцігне ўваскрэсення на зямлі.

Двое першых людзей былі памешчаны ў райскі сад і атрымалі задачу падпарадкавання сабе зямлі. Калі б яны захавалі паслухмянасць Богу, яны ніколі не пастарэлі б і не памерлі. У вызначаны Богам час уся зямля мела быць падпарадкавана і заменена дасканалым Адамавым патомствам у рай (Быццё 1:28; 2:8,9). Аднак Адам і Ева свядома саграшылі, прыводзячы на сябе і сваё будучае патомства смерць (Быццё 2:16,17; 3:17-19). Таму як праз аднаго чалавека грэх увайшоў на свет, а праз грэх смерць, так і смерць перайшла на ўсіх людзей, таму што ўсе саграшылі (Рым. 5:12).

На зямлі быў толькі адзін чалавек, які нарадзіўся без спадчыннага грэху. Быў ім дасканалы Сын Божы Ісус Хрыстос, жыццё якога было перанесена ва ўлонне яўрэйскай дзевы Марыі. Ісус не ўчыніў ніводнага грэху, таму стаў дастойным несмяротнасці. Ягоная смерць мае вартасць выкуплення за грахі свету (Матф. 20:28, Іаан 1:29), таму слушна мог сказаць: „Я ёсць уваскрэсенне і жыццё; веруючы ў Мяне калі і памрэ, ажыве" (Іаан 11:25).

Тады сапраўды можам падмацоўвацца думкай пра паўторнае спатканне з блізкімі, якія памерлі, але мусім верыць у Ісуса, у выкупленне Ім нашых грахоў. Усё залежыць ад нашых цяперашніх паводзін. Хто падпарадкоўваецца Божай уладзе, здзяйсняемай Ягоным Сынам Ісусам Хрыстом, таго чакае ўзнёслае блаславенне.

Пасля смерці чалавека атамы, з якіх збудавана яго цела, убіраюць у сябе расліны, а тыя ў сваю чаргу становяцца кормам іншых істотаў і пастаўляюць матэрыял для збудавання іх цел. Надзеяй для даўно памерлых людзей з'яўляецца Творца нашага агромнага сусвету, Ягоная неабмежаваная памяць. Яна дасканалая і захоўвае ўсе весткі пра памерлага чалавека, пра якога Бог хоча памятаць.

Уміранне, гэта толькі скіданне нашага цела, так як скідаецца старое зношанае адзенне, або пераход з аднаго памяшкання ў іншае. У Кнізе Прапаведніка (Экл. 12:7) чытаем: „І вернецца прах у зямлю, чым ён і быў, а дух вернецца к Богу, які даў яго". Ісус сказаў: „Я іду рыхтаваць месца вам (...) каб і вы былі там, дзе Я" (Іаан 14:2,3). А злодзею на крыжы: „Сёння будзеш са мной у раю" (Лк. 23:43).

Іншыя вытрымкі Святога Пісання пацвярджаюць, што стан памерлых нагадвае сон. Не ўнушаюць яны, быццам у чалавека была несмяротная душа, якая з ягонай смерцю пераходзіць у духоўную сферу. Наадварот, у Бібліі сказана: „памерлыя нічога не ведаюць, (...) і любоў іх, і нянавісць, і зайздрасць ужо счэзлі, (...) таму што ў магіле, куды трапіш, няма ні працы, ні роздумаў, ні ведаў, ні мудрасці" (Экл. 9:5,6,10). З чалавека „выходзіць дух яго і ён вяртаецца ў зямлю сваю; у той дзень чэзнуць усе думкі яго" (Пс. 145:4).

З прыведзенага адназначна вынікае, што пасля спачыну смяротным сном памерлыя не могуць нас ні бачыць, ні чуць. Не могуць яны таксама блаславіць нас, ні прычыняць нам няшчасцяў. Няма іх ні ў небе, ні ў краіне продкаў. Яны мёртвыя, перасталі існаваць. Людзі, якія спяць у смерці і пра якіх Бог помніць, будуць у вызначаны Ім час уваскрэшаны для жыцця ў райскай зямлі. І ў раю людзі атрымаюць надзею на бесканечнае жыццё, бо псалтыр гарантуе: „Праведнікі наследуюць зямлю і жыць будуць на ёй навекі" (Пс. 36:29).

* * *

Рэфлексіўны настрой лістападаўскага свята спрыяе дарожным сутыкненням, выпадкам. Нягледзячы на заклікі і асцярогі штогод у святочныя дні на дарогах гіне некалькі дзесяткаў людзей з ліку некалькіх сотак удзельнікаў дарожных выпадкаў. У тых месцах зноў паявяцца характэрныя крыжы. Выпадкі, як паказваюць статыстыкі, найчасцей здараюцца ў малых мясцовасцях, калі пешаходы ідуць краем недастаткова асветленай дарогі. Многім разагнаным па дарогах шафёрам адмаўляюць тормазы, але іншыя — здаровага розуму. А ён жа падказвае, што ў асеннія дажджлівыя дні вельмі лёгка апынуцца на могілках — не заўсёды каля магілы найбліжэйшых.

Міхал Мінцэвіч

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Малое асвячэнне вады пасля першай Літургіі

Нечаканая радасць

Святкаванні ў гонар іконы Божай Маці „Нечаканая радасць" адбыліся 12 кастрычніка ў Свята-Троіцкім саборы ў Гайнаўцы з удзелам архімандрыта Паісія — настаяцеля прыхода св. Іаана Лесвічніка ў Варшаве.

У час усяночнага богаслужэння вернікі маліліся каля вынесенай з алтара іконы „Нечаканая радасць". Усе важнейшыя падзеі ў гісторыі Гайнаўскага прыхода спалучаны менавіта са святкаваннямі ў гонар гэтай іконы (закладка на будову Свята-Троіцкага сабора і яго асвячэнне). Нечаканай радасцю для вернікаў у гэтым годзе было выкананне летам ківота для іконы свяціцеля Мікалая Цудатворца, які з'яўляецца заступнікам парафіі (старая драўляная царква была збудавана ў яго гонар і ніжняя царква сабора захавала яго імя). Па велічыні і спосабе выканання ківот гэты падобны на ківот вялікай іконы „Нечаканая радасць". Абодва ківоты выконваў вядомы ў Гайнаўцы столяр Аляксандр Асіпюк.

— Ківот для іконы свяціцеля Мікалая выканаў я адплатна, а для іконы Божай Маці як ахвяру. Зараз раблю прастол для манастырскай царквы ў Зверках, а раней зрабіў гроб у Царкву св. Іаана Хрысціцеля ў Гайнаўцы, — сказаў Аляксандр Асіпюк.

Познім вечарам прыхаджане чыталі акафіст і маліліся перад вялікай іконай Божай Маці. Чарговым богаслужэннем была супольная паніхіда ля магілы галоўнага будаўнічага сабора, айца Антонія Дзевятоўскага ў ніжняй бакавой царкве св. Антонія Пячэрскага.

Святую Літургію ўзначаліў архімандрыт Паісій. У час пропаведзі перасцерагаў ён перад мяшанымі шлюбамі, якія найчасцей вядуць да пакідання праваслаўнага веравызнання. Хаця штораз больш католікаў прыходзіць маліцца ў варшаўскую царкву на Волі, то яшчэ больш праваслаўных з Варшавы пакідае праваслаўнае веравызнанне і пераходзіць на рымакаталіцтва. Хаця ў Гайнаўцы гэты працэс яшчэ слабы, то мешаныя сямействы рэдка рашаюцца маліцца супольна ў царкве.

Святкаванні закончыліся хрэсным ходам і малітвамі каля сцен сабора. Вернікі і паломнікі з навакольных мясцовасцей набіралі асвячоную ваду. Наймалодшыя не хацелі вяртацца дадому без цацак, якія прадаваліся за царкоўнай агароджаю. Побач ласункаў прадавалася таксама царкоўная літаратура. Прывезлі яе манашкі з Гарадка каля Пачаева на Украіне. Яны будуюць у манастыры новую царкву, бо прыхільнікі Нацыянальнай украінскай царквы перанялі мураваны храм, які раней належаў да Рускай патрыярхіі. Ад праваслаўных вернікаў з Польшчы атрымліваюць яны грашовыя ахвяраванні і на будову царквы адводзяць прыбытак ад продажу царкоўных кніжак і іконак.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Суражскі помнік

Мо з паўкіламетра за Суражам, каля пяцідзесяці метраў на поўнач ад шашы ў Дакторцы, узвышаецца сярод поля праваслаўны крыж. Абведзены ён дзвюма агароджамі: вонкавай з дроту па калках і ўнутранай з чыгуначных рэек. На гарадскім плане Суража месца гэтае пазначана як праваслаўныя могілкі. Плошчы, якую ахоплівае вонкавая агароджа, будзе мо з пяць араў; у яе межах стаіць яшчэ старая каменная стэла, на якой да гэтай пары не захаваўся ніякі надпіс. Затое на жалезным крыжы ёсць чыгунная таблічка з эпітафіяй: „Здесь покоится прахъ Ивана Никифоровича Метелева, род. 20 мая 1833 г. ум. 17 февр. 1893. Спи родной дорогой, память вечная тебе. За тебя молится будутъ жена и дети на земле".

Яшчэ паўгода назад месца гэтае было зарослае кустамі. Але ў канцы чэрвеня ў Канцавізну з'явіўся Славамір Галіцкі, старшыня Таварыства прыяцеляў Суража, з ініцыятывай упарадкаваць старую некраполію. І разам з Анатольюшам Крукоўскім з Канцавізны і Веславам Аўсейчуком з Завыкаў-Фермы высеклі яны кусты і расчысцілі тэрыторыю колішніх могілак. Якая гэта была праца, можа даць уяўленне абсмалены абрубак ад буйнай вярбы зараз за вонкавай агароджай.

Самога Славаміра Галіцкага мо яшчэ хто з нашага асяроддзя і прыпамінае; некалькі гадоў назад ён быў упаўнаважаным беластоцкага ваяводы па справах нацыянальных меншасцей. Але ён гэтым мала цікавіўся — яго рупіць галоўным чынам іншая справа — турызм. У мінулым годзе ён балаціраваўся на пасаду суражскага бурмістра, але без поспеху. Мо яму гэта і няўдача, але ў выніку, у агульным разліку, ён надалей астанецца дзейнічаць у напрамку выяўлення важных краязнаўчых гістарычных цікавінак, у іх ліку і тых, якіх шмат хто закрыў бы кустоўем.

Аляксандр Вярбіцкі

Пенсіянеры хочуць радасна праводзіць час

Фота з асабістага фонду Уладзіслава Камарчука

Бельскія пенсіянеры на Крыначцы ў 2002 годзе; Уладзіслаў Камарчук усярэдзіне (з гадзіннікам на руцэ)

— Як цяпер жывецца пенсіянерам? — пытаю Уладзіслава Камарчука з Орлі, шафёра-пенсіянера, адзінокага але і жыццярадаснага, які на X Фестывалі беларускай песні атрымаў трэцюю ўзнагароду сярод салістаў.

— Гэта ўсё залежыць ад велічыні пенсіі. Адзін мае дзве з паловай тысячы, а другі 600 злотаў і кантраст між імі — у наяўнасці: першы жыве чатыры разы лепш. Калі маеш грошы, тады ты пан! Калі хто едзе на прыгожай машыне, тады людзі з увагай гавораць пра яго, а калі нейкі абарванец просіць на вуліцы 30 грошаў, дык вядома, што гэта „дзед". Мне маіх 800 злотаў малавата.

Працаваў я 22 гады шафёрам у ПКС, пасля ў Пажарнай камандзе ў Гайнаўцы, разам 36 гадоў за рулём. Каб дарабіць, ездзіў па дамове ў беластоцкім МПК, але і гэта не паправіла майго дабрабыту.

Кожны чалавек мае свае патрабаванні, адзін меншыя, другі — большыя. Аднаму дзве з паловай тысячы замала, а іншаму хапае і 600 ці 800 злотаў.

Ці я сумую яшчэ за рулём? Цягне ўвесь час. Калі б цяпер хто даў мне самаход (свайго не дарабіўся), то я б сеў і адразу ў Мінск! Чаму? Бо люблю ездзіць, я з гэтай цягай, відаць, нарадзіўся, — падкрэслівае мой суразмоўца.

— А як праводзяць вольны час навакольныя пенсіянеры, — пытаю, — якія не пагаджаюцца сядзець дома?

— Я, напрыклад, з'яўляюся членам Клуба сеніёра „Пшыязнь" у Бельску-Падляшскім, які гуртуе каля 60 асоб; кіруе ім Яўгенія Дмітрук. У клубе ў аўторкі і суботы, апрача посту, адбываюцца сустрэчы, патанцоўкі. Ёсць акардэаніст, скідаемся яму: мужчыны па тры, а жанчыны па два злоты.

Час ад часу ладзім экскурсіі, напр. у Аўгустаў (былі сёлета, плавалі на караблі), Сямятычы, Драгічын, на Крыначку (пасля багаслужбы паехалі ў гайнаўскі „Гурнік" на забаву). Наведваем іншых пенсіянераў, а яны прыязджаюць да нас. Паходзім, паглядзім, але галоўным пунктам мерапрыемства з'яўляюцца патанцоўкі. І здараецца так, што людзі знаёмяцца і пасля звязваюцца шлюбам; за тыя некалькі гадоў, што я належу да клуба, некалькі пар пажанілася, але далей прыходзяць на сумесныя сустрэчы.

Калі б не клуб, было б нудна. Для прыкладу, у такой Орлі адзінокі чалавек раз мае гумар, а раз яго няма. А калі паедзеш, то ўжо інакш. Раз у Гайнаўцы сустрэліся пенсіянеры з чатырох клубаў, там вялікая зала, кожны расклаў свой кошык з ежай і напоямі. А калі бедная пара жэніцца, дык можна прыйсці ў клуб і прыкідвацца, што яна вяселле ладзіць, а кожны і так сваё спажывае; гэта іх нічога не каштуе. І добры такі шлюб.

Ці я маю партнёрку для танцаў? Маю ў Орлі, але не заўсёды нам ладзіцца, бо я належу да беларускага калектыву „Арляне" і калі ў суботу даем выступленне, у той час адбываецца і сустрэча ў бельскім клубе. У калектыве спяваю ад шасці гадоў ды і ў час сустрэч у клубе спяваю беларускія песні. Наш інструктар Мікалай Фадзін з Гродна абяцаў, што прывязе мне прыгожую песню для выканання на чарговым аглядзе, у лютым; хацелася б узяць лепшае, другое месца. У арлянскім калектыве цяпер 12 асоб. Сёлета, з-за жалобы па войце Яну Добашу, мы мала канцэртавалі. Напэўна паедзем на калядны агляд. Беларускія песні мне блізкія (мой размоўца каталік — М.М.), многа іх ведаю і выконваю так для шырокай, як і камернай публікі, — падкрэсліў на заканчэнне Уладзіслаў Камарчук і праспяваў мне свае любімыя „Нёман", „Думаў жаніцца", „Дранікі" і „Зося-беларусачка".

Міхал Мінцэвіч

У Расіі

Ля грабніцы прападобнага Серафіма

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Грабніца прападобнага Серафіма знаходзіцца ў капліцы. Побач — Казанская царква

Чарговым месцам, якое мы наведалі, была курортная мясцовасць Вырыца. Большасць пасажыраў, якая выйшла на гэтай станцыі, падалася ў напрамку невялікай рэчкі.

Да месца пахавання прападобнага Серафіма Вырыцкага трэба было перайсці пяшком тры кіламетры. У драўляных дамах пераважна жывуць старэйшыя асобы, якія не выехалі на пастаяннае жыхарства ў Пецярбург. Ішлі мы паралельна да рэчкі і міналі новыя дачы, якія гарманіруюць са старым будаўніцтвам і акружаючым лесам. На панадворках красаваліся бані — неадлучны элемент вясковых краявідаў у Расіі. У вучнёўскім лагеры адпачывалі дзеці і моладзь. З невялікага магазіна выходзілі людзі і напраўляліся ў напрамку рэчкі. Каля вады адпачывала шмат людзей.

На цвінтары сустрэлі мы некалькі асоб. Побач драўлянай Казанскай царквы знаходзіцца каплічка з грабніцай прападобнага Серафіма Вырыцкага. Паломнікі прыкладаліся да грабніцы, прыкладалі да яе іконкі з выявай святога і ў скрыначцы з пяском ставілі свечкі. Гэты пясок раздаюць вернікам як вялікую святасць, што выкарыстоўваецца для лячэння хвароб. Яшчэ пры жыцці старац Серафім сказаў: „Калі некаму будзе патрэбная мая дапамога, дык прыходзьце да мяне на магілу як да жывога. Раскажыце аб сваёй патрэбе, а я дапамагу".

Больш чым пяцьдзесят гадоў вернікі ездзілі маліцца да магілы бацюшкі. Праваслаўная царква кананізавала схіманаха Серафіма ў 2000 годзе. Кніжкі пра яго жыццё распаўсюджваюцца сярод вернікаў Расіі і замежжа. Нядаўна выдавецтва „Братчык" з Гайнаўкі выдала кніжку „Сучасны святы старац Серафім Вырыцкі (Васілій Мікалаевіч Мураўёў 1865-1949)".

Васілій Мураўёў займаўся купецкай дзейнасцю, гандляваў з замежжам. Многа маліўся і памагаў бедным. Каля 1920 года Васілій Мураўёў разам з жонкай Вольгай рашыліся пакінуць свецкае жыццё. Сам паступіў у Аляксандра-Неўскую лаўру, а жонка ва Уваскрэсенскі Новадзявічы манастыр у Пецярбургу. У 1920 годзе Васілій Мураўёў стаў манахам з іменем Варнавы. Шэсць гадоў пазней выбралі яго галоўным духоўнікам лаўры, пастрыглі ў схіму з іменем Серафім і ў канцы дваццатых гадоў стаў ён выганяць з людзей дэманаў і лячыць. Хутка сам стаў хварэць, а ад 1929 года, калі закрылі лаўру, быў ажно 14 разоў арыштаваны і многа працярпеў у турмах. У 1933 годзе атрымаў бласлаўленне пераехаць у курортную мясцовасць Вырыца. Хаця ляжаў у пасцелі, прымаў паломнікаў, якія прыязджалі за парадамі і дапамогай. Многа пасціўся і маліўся. У час II сусветнай вайны маліўся, стоячы на камені ў агародзе, за выратаванне Расіі ад акупанта. Жанчынам прадвяшчаў час вяртання іх мужоў з фронту або інфармаваў аб смерці. Прадказаў, што Расія пераможа ворага, людзі вернуцца да праваслаўнага веравызнання, што праваслаўным будуць вернуты Троіцка-Сергіева лаўра і Дзівееўскі манастыр, і што малітвы загучаць па радыё.

На ўсяночным богаслужэнні ў Казанскай царкве людзі маліліся ў вялікай цішыні, адчуваючы прысутнасць прападобнага.

Аляксей Мароз

У школе ў Шымках

Захоўваюць старое

Трэці год настаўнікі Анна Азябла і Марэк Харытанюк вядуць этнаграфічны міні-музей у Пачатковай школе ў Шымках (Міхалоўская гміна). У ім штогод прыбывае экспанатаў. Тут даволі многа сельскагаспадарчых прылад працы. У кожным куточку што іншае. Ёсць прылады для працы на полі, на сенажацях або ў стадоле, на таку. Зусім іншыя прылады былі неабходныя ў кухні ды ўвогуле ў хаце.

Што можна ўбачыць у школьным музеі — усяго не пералічыць. Аднаго можа зацікавіць стары посуд і хатнія прылады, другога — усё, што служыла сялянам у стадоле ды на панадворку, а яшчэ каго — пасека.

У шымкаўскай школе дзеці асабліва цікавяцца гісторыяй вёскі і ваколіцы. Яны шмат ведаюць пра мінулае. Музей добра гэтаму служыць. Настаўнікі папаўняюць яго фотаздымкамі, на якіх відаць колішнюю апрацоўку зямлі, жывёлагадоўлю, выкананне вопраткі.

У міні-музеі дзеці могуць дакрануцца рукой да праса, масленіцы, калаўротка, сахі, жорнаў, драўлянай бараны, хамута і шалестуноў. Гэтыя прадметы рэдка дзе сустрэнеш. У Шымках настаўнікі захоўваюць старое. Неўзабаве прывязуць кросны, прынясуць гвязду ды іншыя прадметы.

Янка Целушэцкі

З месячнага боку

Дарагая Домна! Снілася мне, што я ў ЗША, запрошаная з калегамі, здаецца, службова. У мяне прыгожыя, хоць нявыгадныя боты, на высокім абцасе, і вельмі стройныя ногі ў панчохах (у рэальнасці далёка мне да гэтага), хтось нават звяртае на іх увагу, ды я кажу, што боты ціснуць.

Еду без білета аўтобусам, плачу штраф 30 долараў (у мяне іх 35). На нейкім складзе ці месцы, дзе ляжаць непатрэбныя тавары (усе яны добрыя, прыгодныя для ўжытку, у прыгожых упакоўках) бярэм усе, што нам падабаюцца. Памятаю, выбрала я сабе м.інш. цюбік нейкага крэму, а ўсяго ў мяне столькі, што няма ў што пакласці — сумачка ў мяне маленькая.

Адзін з сяброў — ён вучыўся са мною ў ліцэі, цяпер займаецца міжнароднымі справамі, далей утрымліваю з ім кантакты — мае свае справы, хоча ехаць далей, а я трывожуся, што не дам сабе рады адна ў чужой краіне, тым больш, што не ведаю мовы. Марыся

Марыся! Не без прычыны выдумалі прымаўку, што вучымся ўсё жыццё. Няважна, колькі табе гадоў, усё штосьці цябе можа задзівіць, а ты, як дзіця, стараешся зразумець: у чым справа? Як над усім у сваім жыцці, таксама і над мудрасцю, трэба папрацаваць. Аб гэтым і твой сон. Дае табе падказкі, што магла б ты зрабіць, каб разумней, значыць, лепш сабе ў жыцці спраўляцца.

Уяві сабе, што ты — гераіня нейкай казкі і, як гэта ў казках здараецца, вандруеш па скарбы. Калі справішся з цяжкасцямі і выканаеш заданне, якое на пачатку здавалася цяжкім, а потым дойдзеш да мэты, будзеш больш шчаслівая і разумная. Ты ўжо рушыла, альбо неўзабаве выберашся ў новую вандроўку па свае „псіхічныя" скарбы.

Да пошукаў новых развязак найчасцей схіляе нас незадавальненне актуальнай сітуацыяй. Але не заўсёды. Часам, проста, не хочацца нам нічога змяняць, але жыццё — разумнейшае. Вядзе нас такім чынам, што мусім штосьці з сабой зрабіць, каб не стаяць на месцы, значыць — развівацца. Хтосьці нават сказаў, што адзінае, што гарантавана ў жыцці — змены. Найчасцей самі адчуваем, што час ужо штосьці зрабіць, штосьці змяніць, ды баімся таго. Баімся перамен. Мне, аднак, здаецца, што так ёсць у тваім выпадку: адчуваеш, што не ўсё добра, але гэта жыццё папіхвае цябе да дзеяння.

Можа, не без прычыны прыснілася табе, што ты ў Амерыцы. Можна сказаць, сніцца табе такі „амерыканскі сон": усё добра, бяспечна, можна нават бесклапотна глядзець на жыццё праз ружовыя акуляры. Ты прыгожая, можаш нават рабіць памылкі, бо маеш грошы на тое, каб за іх заплаціць. У дадатку атрымліваеш неспадзяваныя падарункі ад лёсу. Быццам бы ўсё ў парадку — хваляць цябе людзі, а ты, усё ж, не адчуваеш сябе прынцэсай у гэтай амерыканскай казцы.

Што сведчыць аб гэтым? Па-першае, не патрапіш прыняць кампліменты аб сваёй красе. Замест таго, важнейшая для цябе свядомасць, што мяшаюць табе нявыгадныя боты. Быццам бы ножка стройная, ды бот неадпаведны, і прынцэса адчувае сябе нешчаслівай. Ты хацела б таксама забраць з сабою як найбольш дармовых падарункаў, але сумка ў цябе замалая. Лёс табе спрыяе, атрымліваеш ад яго прэзенты, але няма ў цябе адпаведных „прылад", каб адпаведна гэтым карыстацца. І гэта цябе турбуе.

Каб адчуваць сябе добра, мусіш падабраць адпаведныя „боты". Гэтыя, якія цяпер маеш, нядобрыя, хаця здаюцца такімі „прыгожымі". Сон падказвае, што, мабыць, неабходная будзе змена жыццёвага стаўлення, каб ты магла паўней цешыцца жыццём. Са сну вынікае, што жыццё змабілізуе цябе да самастойнасці, каб магла ты паўней ім цешыцца. Дарэчы, сама ты гэтага патрабуеш. Мабыць, адчуваеш, што цяперашні камфорт, бяспека гэта толькі зман. Каб адчуць сябе ўпэўненай, мусіш штосьці перажыць, чагосьці дасведчыць.

Па-першае, сама мусіш адважыцца і перамагчы свой страх, які ў сне паказваецца як апаска таго, што сябра пакіне цябе за мяжой. Можа, апынешся ў нейкай новай для цябе сітуацыі і будзеш мусіла знайсці выхад, каб сябе там „знайсці". Гэта таксама выклік, каб навучыцца чагосьці новага: не толькі браць з жыцця тое, што трапляецца выпадкова, але таксама і рашаць аб ім. Гэта ў абсягу тваіх магчымасцей, але ты найперш павінна быць больш адважнай і самастойнай. Калі будзеш умець знайсціся ў новых сітуацыях, не будзеш баяцца змен, і будуць гэта твае „псіхічныя скарбы". Даб'ешся іх, калі пройдзеш выпрабаванне, якое прадказвае гэты сон. Перад табою чарговыя крокі ў жыццёвую мудрасць, на якую складваецца таксама ўмеласць спраўляцца з новымі сітуацыямі.

Домна (domnason@wp.pl)

Два бакі банкаўскага білета

Выбраўся я ў бок Грыбоўшчыны збіраць матэрыял на ніўскія старонкі. На аўтобус, што перад шостай раніцы едзе з Беластока ў Крынкі, прымеркаваўся я сесці на прыпынку, што па вуліцы Сянкевіча, „над Бялкай". Калі машына пад'ехала на прыпынак, маю ўвагу сярод спяшаючых да яго падарожнікаў прыцягнуў лёгка прыгорблены стараваты мужчына ў гумовых ботах і паношаным доўгім плашчы з байкаватым кошыкам. Здзівіўся я, што такі старэча збіраецца, мабыць, у грыбы. Неўзабаве здзівіў ён мяне яшчэ больш, калі папрасіў льготны білет для інваліда першай катэгорыі — у Пачапок! А ў Пачапку адно будынкі лясной адміністрацыі і навокал — лес. Як не баіцца, занепакоіўся я, такі хілы інвалід ехаць у тое бязлюддзе...

Мой герой злез з аўтобуса ў Пачапку, а я крыху далей — у Паўночным Востраве. Але, абышоўшы навакольныя мясцовасці, вяртацца ў Беласток прыйшоў я ў пасляабедзенную пару на прыпынак у Пачапок. А там, на лавачках, расклаў свае рэчы мой ранішні знаёмы. Стаяў поўны кошык апенькаў, побач яго мала меншая пластмасавая сумка, таксама з грыбамі, а ён сам акурат канчаў есці. Паколькі я, не хочучы мясіць макраваты жвір на тамашніх дарогах, хадзіў лесам метраў дзесяць-пятнаццаць ад гасцінца, таксама некалькі грыбчыкаў з сабою меў. Дзедка, паведаміўшы, што толькі што скончыў снеданне, адразу пацікавіўся маім ураджаем, а неўзабаве спытаў мяне, ці ў Беластоку буду высаджвацца на Юравецкай; на прыпынку чакала яшчэ жанчына, але паколькі яна мела негрыбныя багажы, дзедка не цікавіўся яе асобай. Я даволі неахвотна адказаў, што злезу з аўтобуса або раней, або пазней.

— Бо калі б вы, — патлумачыў дзедка, — выходзілі на Юравецкай, то маглі б ехаць у характары майго апекуна, дармова.

— Цяпер апякун мусіць плаціць пяць працэнтаў ад цаны нармальнага білета, — заўважыла спадарожніца, а я падтакнуў ёй.

Усё ж такі дзедка не зняў свае прапановы і я згадзіўся ехаць на Юравецкую. Дзедка купіў падвойны білет, сабе — за 3,80 зл. — і мне, „апекуну" — за трыццаць восем грошаў; ужо ў аўтобусе мой „падапечны" паказаў мне, колькі за мяне заплаціў...

За Сакалдою аўтобус пацярпеў аварыю. Пасажыры не надта цікавіліся, што здарылася, але дзедка шустранька выбег з аўтобуса, пазнаёміцца з абставінамі; за ім неахвотна, але дзеля прыстойнасці, вылез і я. Неўзабаве падабраў нас іншы аўтобус і мы прыкацілі ў Беласток; на развітанне даў я свайму „падапечнаму" дваячка.

Вось такое меў я дачыненне з чалавекам, які паводле дакументаў вельмі хворы і ў дарогу павінен падавацца толькі пад здаровым наглядам. У сапраўднасці ж справа маецца інакш і такая з'ява, дзе „на розум не хварэюць", не адзіночная, але ў нашым грамадстве даволі частая, бо за ўсімі такімі ілюзіямі стаяць грошы, немалыя. Льготы і дадаткі за інваліднасць гэта адзін бок банкнота, а другі бок — тыя інвалідныя дакументы таксама не ўзяліся дармова.

У перадавіках польскай прэсы красуюцца прозвішчы Наўмана, Ямрожага, Вячэжака — усе яны ў сваім мінулым прысягалі: па-першае — не шкодзіць. І яны, памагаючы па-рознаму хворым людзям, асвоілі тое асаблівае хобі, дзякуючы якому трапілі на першыя старонкі. Грамадства абураецца на хцівасць высокіх чыноўнікаў забываючы, што выраслі яны ўсё-ткі з нізоў, дзе паціху патуралі іх радавыя нашы суграмадзяне, у іх ліку і пажылыя грыбнікі ў гумовых ботах і паношаных плашчах — модна „ўзяўшы справу ў свае рукі". Абагульняючы — ці не самыя мы?..

Аляксандр Вярбіцкі

Гайнаўка

Аматарскае таксама прыгожае

Гайнаўскі дом культуры арганізуе X Агляд непрафесійнага мастацтва Гайнаўшчыны ад 14 снежня 2003 года да 31 студзеня 2004 года. Прыняць удзел у ім можа кожны стваральнік, мастацкі самадзейнік, якому сама менш 18 гадоў. Тэматыка і тэхніка выканання прац адвольная, любая. Трэба прынесці тры-пяць прац з адной галіны жывапісу, рысунку, графікі, разьбы, інтарсіі, мастацкай тканіны або металапластыкі, у ГДК, вул. Беластоцкая 2, да 30 лістапада г.г.

Працы журы будзе ацэньваць у дзвюх катэгорыях: самародныя творцы ды выпускнікі сярэдніх пластычных школ. Прадбачваюцца ўзнагароды і вылучэнні, а таксама выстава найлепшых прац у ГДК. Арганізатар звяртаецца з заклікам да ўсіх зацікаўленых асоб, каб даставілі свае працы як найхутчэй па прычыне падрыхтоўкі выставачнага буклета. Будзе ён добрай памяткай з юбілейнага агляду.

Янка Целушэцкі

Рэпертуар Лялечнага тэатра ў Беластоку

Праграма для дзяцей

„Мы ваўка не баімся". Аўтар — Іва Фішэр, пераклад — Рэната Пуцляхер, рэжысура — Пэтр Носалек, сцэнічнае афармленне — Павэль Губічка, музыка — Кшыштаф Дзерма.

05.11. — 9°° і 11°°
06.11. — 9°° і 11°°
07.11. — 9°° і 11°°
08.11. — 11°°
09.11. — 11°°
14.11. — 9°° і 11°°
15.11. — 9^{00} і 11^{00}
16.11. — 11^{00}
18.11. — 9^{00} і 11^{00}
19.11. — 9^{00} і 11^{00}
20.11. — 9^{00} і 11^{00}
21.11. — 9^{00} і 11^{00}
22.11. — 11^{00}
23.11. — 11^{00}
25.11. — 9^{00} і 11^{00}
26.11. — 9^{00} і 11^{00}
27.11. — 9^{00} і 11^{00}
28.11. — 9^{00} і 11^{00}
30.11. — 11^{00}

Праграма для дарослых

„Мерлін Мангол". Аўтар — Мікалай Каляда, пераклад — Ежы Чэх, рэжысура — Вальдэмар Смігасевіч, сцэнічнае афармленне — Мацей Прэер, музыка — Кшыштаф Дзерма.

08.11. — 18^{00}
09.11. — 18^{00}
15.11. — 18^{00}
16.11. — 18^{00}
22.11. — 18^{00}
23.11. — 18^{00}

(лук)

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2004 r. upływa 5 grudnia 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Якая гэта мясцовасць?

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

У краме:

— Прадайце мне добрае віно на дзесяцігоддзе шлюбу, — заказвае мужчына.

— Шаноўны пан хоча святкаваць ці забыць?

* * *

Муж з жонкаю ідуць горадам. Яна ўбачыла ў краме з бялізнай далікатныя трусікі і просіць мужа:

— Купі мне іх, яны такія прыгожыя.

Муж глянуў на яе клубы і кажа:

— Для такога камбайна такія маленькія трусікі не падыходзяць.

Вярнуліся дадому. Уначы ён прыміляецца да яе.

— Адчапіся! — адмаўляе яна. — Не буду запускаць цэлы камбайн для аднаго ліхога каласка.

* * *

Янка едзе на аўтамабілі і бачыць ля дарогі прыгажуню, якая махае яму рукою.

— Падвезці? — пытае яе.

— Не, па дзвесце пяцьдзесят!

* * *

— Не разумею, — наракае жонка мужу. — Дваццаць гадоў таму ты быў шчаслівы, калі бачыў мяне хаця дзве мінуткі ў дзень.

— Але ж, каханая, нічога не змянілася. Я сёння таксама шчаслівы, калі бачу цябе адно дзве мінуткі ў дзень.

* * *

— Хто такі інтэлектуал?

— Гэта такі чалавек, які заходзіць у кнігарню нават тады, калі не ідзе дождж.

* * *

— Учора адведаў я сябра ў турме; праз тыдзень выходзіць на свабоду...

— Напэўна, радуецца?

— Не надта. У яго доме няма тэлевізара.

* * *

— Што трэба зрабіць, калі голуб напаскудзіць на галаву?

— Падзякаваць Богу, што не даў карове крылаў.

* * *

Янка пытае Марусю:

— Каторай жанчыне бусел найперш прынясе дзіця: незамужняй, замужняй ці ўдаве?

— Замужняй.

— Ой, Маруся! А я не падумаў, што ты надалей верыш у буслоў.

* * *

— Чаму ў бусла доўгія ногі?

— Каб не валок немаўлят па зямлі.

* * *

— Чаму буслы адлятаюць у цёплыя краіны?

— Бо і негры хочуць мець дзяцей.

Адгаданка

1					
2					
3					
4					
5					
6					
7					

1. майстар, які займаецца коўкай металу, 2. дзве жэрдкі без насцілу для пераноскі сена ў копах, 3. белаватая пляма на рагавой абалонцы вока, 4. перад жніўнем, 5. радавы марак, 6. металічнае прыстасаванне з загібам на канцы для, напр., лоўлі рыб, 7. дзяцел Сандара Жоржавіча.

(Ш)

Рашэнне адгаданкі атрымаецца з літар у светлай калонцы. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 37 нумара

Крывіч, палена, агурок, медаль, барсук, вусень, цягнік, бульба.

Рашэнне: **Верасень**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Надразумнікі

Хто разумнейшы — бландзінкі ці брунеткі? А, можа, рудыя або і лысыя? Мужчыны ці жанчыны? Хто пытаўся? Усе пыталіся, беручы ўдзел у праверцы інтэлігентнасці народа. І Агата запыталася ў мяне. Ну, добра, кажу, прымаў я ўдзел, атрымалася ў мяне крыху больш пунктаў ад сярэдняй. Геніем я не стаў, на жаль, хоць мо і быў калі. Мозг жа ж таксама старэе, хоць за ўсё жыццё чалавек не выкарыстоўвае і дзесятай яго часткі. Хапіла б мозгу чалавечага на прынамсі тысячу гадоў. А мо і на вечнасць. Гэткую прыладу даў Айцец Адаму, на зайздрасць Люцыпару, а і цела даў цікавае, прыгожае. А што мы псуемся, дык што зробіш — вынік гэта, як вядома, першароднага граху. А звязаны гэты грэх са спажываннем таго чаго нельга. Ага, што я зноў на свайго коніка ўскочыў! — Агата зноўку спыталася пра вынікі тэсту на інтэлігентнасць нашага народа, які збіраецца ў Еўропу. Ну, добра, кажу, на пару пунктаў мы горшыя ад найінтэлігентных, брытанцаў, але таксама за сто. Нармальныя. Сярод нас трапіцца і геній, і менш разумны. Але няма (гляджу на маіх калег) сярод нас лаўрэата Ig-Нобеля.

— Маеш такіх знаёмых, Агата, якім той анты-Нобель дастаўся?

— А чула, чула. Прафесар Іукіо Гіросе, сёлетні лаўрэат Нобелеўскай Ig-прэміі ніяк не можа зразумець, што ягонае навуковае адкрыццё афіцыйна палічылі смешным.

62-гадовы навуковец з японскага горада Каназава ўчыніў аб'ектам сваіх даследаванняў статую ў сваім родным горадзе на захадзе Японіі. Адкрыў, што на ёй ніколі не сядаюць птушкі, а што за гэтым ідзе, статуя заўсёды чыстая. Правёўшы шэраг вопытаў з рознымі птушкамі і сплавамі бронзы Гіросе палічыў, што адпалохвае ад аб'екта галій — метал які змяшчаецца ў сплаве, з якога выканалі статую. Усё ж, вынікі доследаў не атрымалі прызнання ў акадэмічным асяроддзі Японіі. „Калі я адчытваў даклад, слухачы качаліся ад смеху!" — крыўдаваў прафесар Гіросе. Ніяк не можа зразумець, чаму ягоную працу палічылі камічнай і ўшанавалі Ig-Нобелем. Іукіо Гіросе не першы японскі вучоны, якому дасталася гэта ўзнагарода. Летась такую ж атрымаў Масагіка Каіта, канструктар электроннай прылады для перакладу сабачай мовы. У абгрунтаванні свайго праекта вучоны тлумачыў, што залежала яму на ўсхваленні гармоніі між відамі. А сёлета ўзнагароджаны былі плёны працы над гомасексуалізмам і некрафіліяй у качак, аналізам сіл неабходных валачыць авечку па розных паверхнях, а ў галіне псіхалогіі вылучаны былі Філіп Зімбарда са Станфардскага і Джыяна Віторыо і Клаўдзій Барбанэлі з Рымскага універсітэта за працу „Асабліва простыя індывідуальнасці палітыкаў".

— Таксама і палітыкі прымалі ўдзел у агульнанацыянальным тэсце на інтэлігентнасць. Але вынік некаторых засакрэчаны, — прыпомніў Збышка.

— А што тут засакрэчваць! — махнуў рукою Мікола. — Кожны ж бачыць. Каб быць палітыкам, дык, здаецца, неабходна мець тую „асабліва простую індывідуальнасць". І інтэлігентнасць сакрэтную. Скажы Агаце, каб больш не чаплялася наконт уключэння цябе ў нейкую палітычную плынь і старту ў любых выбарах.

— А чаму ж? Я сама рыхтык сенатар разам з маімі сціплымі 110 пунктамі. *Папрэце* мяне?

— Ой, папрэм! Яшчэ як папрэм! Увесь народ папрэ!

Вандал Арлянскі

Язда не трымаючыся

— Татальная язда! — мая суседка Маня паправіла сваю штучную сківіцу ў хвіліну поўнага захаплення ўбачаным за акном.

Па блёчным падворку на роліках мчаліся, узяўшыся за рукі, Барыс і Клавуня. Маня ўзяла лексіку ад свайго наймалодшага ўнука Рафала. Маня — мая сяброўка яшчэ з маленства, і мяне гэта не вельмі здзіўляе, бо „татальная" была заўсёды. *Ад'яздовая*, як сказаў бы той дванаццацігадовы Рафал. Альбо і... бэстая, як можна пачуць пра іншых рэдкіх бабуль. Я і сам немалады, але больш кансерватыўны. А Маня цяпер, так сказаць, крыху „ўземленая". Не спаткаеце яе на веласіпеднай дарожцы ў Звярынецкім лесе. Няма ў Мані правоў на машыну. Забралі? Ніколі не было. Вазілі яе ўсюды то аўтобусы, то легкавікі, нават і самалёты, і не было патрэбы рабіць правоў. А на ровары — абы навучыўся, кожны дурань паедзе. Можаш не ездзіць паўстагоддзя, а сядзеш, адразу рушыш і не звалішся. Ездзіць на веласіпедах вучыліся мы ў вёсцы разам з Маняй, на адным ровары з рагатым рулём, даваенным, вядома. А цяпер у Мані ровар горны, тут больш трэба паўзірацца на розныя фінціклюшкі пры ім. Нават ланцуг у ім не такі, як калісьці, што адно мог уцягнуць калашыну. Тэхніка! Ну, я на такі ровар сесці баюся, але Маня?! Усё ўнучак паказаў, і рушылі былі яны на падлясныя дарожкі, пазначаныя як роварныя шляхі. У нашым горадзе таксама ёсць пазначаныя шляхі. Але веласіпедысты мчацца без боязі дзе трапіцца, і па тратуары, і па вуліцы. Калі ўжо немагчыма, дык спешваюцца і вядуць сваю павозку...

Ну, а што з тымі Манінымі правамі? Цьфу на іх! Сораму наелася, і, раней не быўшы ў судзе, мусіла стаць перад суддзёй! Цяпер не „калегіюмы" займаюцца такой драбязой, а „гродскія" суды. І ўзялі дый пакаралі...

Мчалася была баба Маня, апранутая ў спартыўны касцюм, у расцягнутай лыжнай шапачцы на сівой галаве, па лясной асфальтаванай сцежцы. Унук, вядома, першы ляцеў на сваім бліскучым ды грымучым веласіпедзе. А раптам з кустоў выбег маленькі сабачка і — бабулі пад колы! Прытармазіла, як належыць, мая сяброўка, сама ледзь не катапультавалася. Сабачка з енкам пару разоў кульнуўся па асфальце і стаў на ўсе чатыры. А з кустоў выбег дзядзька ў адзідасах, схапіў лямантуючыга шчанюка і да веласіпедысткі з крыкам ды ледзь яе за худыя загрудкі не хапае. Зараз і міліцыянераў двух з'явіліся — тутака яны падпільноўваюць розных бандытаў. Спісалі бабулю са сведчання ўнука, бо хто ж на ровар бярэ дакументы? Баба Маня ледзь не плача, тым больш што хістаецца нага — здаецца, паламала...

— У вас правы ёсць?

— Якія правы?

— Каб вадзіць машыну.

— А якая гэта машына! Гэта ж ровар. Зараз, во, і павяду яго дадому...

Баба Маня, аднак, ровара не павяла. У хірургічную клініку павезла яе хуткая дапамога. Адобва равары павёў дахаты Рафал, ейны ўнук.

І страхоўкі не хацелі бабе Мані выплаціць, бо ж без правоў здзейсніла аварыю ды паламала нагу. І ўласнік сабачкі чапляецца, што цюцька перажыў псіхічную траўму, трапіўшы пад колы татальнай сівавалосай веласіпедысткі.

— Ай, як ім добра! — стогне ад зайздрасці і асалоды ўнерухомленая гіпсам баба Маня, гледзячы на сваіх калег-пенсіянераў на роліках.

Бен Гуйвін

ISSN 0546-1960